

Каўбаса не павінна быць на нашым стале асноўнай стравай. Калі чалавек есць мяса і бачыць тлушчавую праслойку, ён хоць бы мае ўяўленне пра тое, колькі з'еў тлушчу. У каўбасе гэтага не відаць. СТАР 3



«У тумане» — карціна, якая для ўсіх стала нечаканасцю, таму што дырэктары здымачных груп, якім прапаноўвалі працаваць на фільме, адмаўляліся: складана... СТАР 5



Беларусы з поўным правам могуць лічыць генерала Вайцяхоўскага сваім. Ён не толькі тут нарадзіўся і вырас, але і паліў гэтую зямлю сваёй крывёй. Ён праявіў сябе як храбры афіцэр і таленавіты камандзір. СТАР 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 КАСТРЫЧНІКА 2012 г. СУБОТА № 204 (27319) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «САВЕТ РЭСПУБЛІКІ ЗАЙМАЕ НАЙВАЖНЕЙШАЕ МЕСЦА Ў ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЕ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

ПЕРШАЯ СЕСІЯ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ — У НОВЫМ БУДЫНКУ

**Учора адбылося першае пасяджэнне першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 5-га склікання. Сімвалічна, што новае скліканне верхняй палаты парламента пачало сваю работу ў адрэканструяваным будынку на вуліцы Чырвонаармейскай, 9, у якім раней размяшчалася Нацыянальная бібліятэка. Пасяджэнне адкрыла старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. Яна нагадала, што ў склад верхняй палаты беларускага парламента выбрана 56 членаў Савета Рэспублікі, яшчэ адзін парламентарый — старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра — прызначаны ўказам кіраўніка дзяржавы (па прэзідэнцкай квоце ў верхнюю палату парламента яшчэ могуць быць прызначаны 7 сенатараў). У адкрыцці першай сесіі Савета Рэспублікі прыняў удзел і сам Прэзідэнт краіны.**

Перад пачаткам пасяджэння Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з умовамі працы сенатараў, работнікаў Сакратарыята Савета Рэспублікі, інфармацыйна-тэхнічным абсталяваннем будынка. Дарэчы, пры рэканструкцыі былой Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі выкарыстаны самыя сучасныя тэхналогіі, створана тут і безбар'ернае асяроддзе для інвалідаў-калясачнікаў.

Падчас свайго выступлення Прэзідэнт Беларусі **прапанаваў зрабіць новы будынак Савета Рэспублікі даступным для ўсіх беларусаў і замежных гасцей.**

«Гэта нармальная сусветная практыка, калі любы чалавек можа прыйсці на экскурсію і паглядзець, як працуе вышэйшы заканадаўчы орган краіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што Савет Рэспублікі цяпер выдатна абсталяваны тэхнічна.

«Сучасныя камп'ютарныя і тэлекамунікацыйныя сістэмы забяспечваюць добрыя ўмовы для вашай працы», — зазначыў беларускі лідар.

Савет Рэспублікі, паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, займае найважнейшае месца ў палітычнай сістэме нашай дзяржавы. СТАР 2

## ЖЫВАЯ ВАДА НА ЮР'ЕВАЙ ГОРЦЫ

Фота БЕЛТА.



Дзве сакральныя крыніцы ўладкаваны ў Віцебскай вобласці пры падтрымцы Прадстаўніцтва Праграмы развіцця ААН (ПРААН) і Праграмы малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду ў рамках праграмы «Жывая вада — ачыстка крыніц Беларусі».
НА ЗДЫМКУ: Свята-Георгіеўская крыніца на Юр'евай Горцы ў Віцебску.

### ЛІЧБА ДНЯ

**26,3 тыс.**

***чалавек зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароны на канец верасня. Гэта на 12,8 працэнта менш, чым на канец верасня 2011 года і на 5,5 працэнта менш, чым на канец жніўня 2012-га. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на канец верасня бягучага года, як і на канец верасня 2011-га, склаў у рэспубліцы 0,6 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва. У агульнай колькасці зарэгістраваных беспрацоўных жанчыны складаюць 49,8 працэнта. Сярэдні памер дапамогі на аднаго беспрацоўнага ў верасні склаў Br140,3 тыс. або 16 працэнтаў ад бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 17° |
| Віцебск | + 14° |
| Гомель | + 15° |
| Гродна | + 16° |
| Магілёў | + 13° |
| Мінск | + 13° |

### Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.10.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8510,00 | ▼ |
| Еўра | 11120,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 276,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1042,76 | ▼ |

## РУБІНАЎ Анатоль Мікалаевіч

### СТАРШЫНЯ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Нарадзіўся 15 красавіка 1939 года ў горадзе Магілёве.

У 1961 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна.

Працоўную дзейнасць пачаў у Інстытуце фізікі Акадэміі навук БССР, дзе працаваў больш за 40 гадоў. Прайшоў шлях ад аспіранта да намесніка дырэктара па навуковай рабоце Інстытута фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выконваў абавязкі акадэміка-сакратара Аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі Акадэміі навук БССР.

У 1965 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1972 годзе — доктарскую. У 1980 годзе яму прысвоена вучонае званне прафесара.

У 1991 годзе абраны акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Член Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтар больш чым 300 навуковых работ, 4 манаграфій і 65 вынаходніцтваў. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны арыгінальныя лазерныя прыборы, адзначаныя дыпломамі і медалямі ВДНГ і ўдастоеныя залатога медаля Міжнароднага Лейпцыгскага кірмашу.



А.М. Рубінаў падрыхтаваў больш за 30 кандыдатаў і дактароў навук.

З 2002 па 2006 год узначальваў Вышэйшую атэстацыйную камісію Рэспублікі Беларусь, з 2009 года — член гэтай камісіі.

З 2006 па 2008 год — першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З 2008 па 2012 год працаваў у Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання на пасадах намесніка, а пасля Старшыні Савета Рэспублікі.

25 верасня 2012 года выбраны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання ад горада Мінска. 19 кастрычніка — Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Член Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Намеснік Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Старшыня Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1980). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1972) і Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1994).

Узнагароджаны ордэнамі Францыска Скарыны, «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейнымі медалямі «65 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

## РУСЕЦКІ Анатоль Максімавіч

### НАМЕСНІК СТАРШЫНІ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Нарадзіўся 14 лютага 1951 года ў горадзе Барысаве.

У 1973 годзе скончыў Беларускі політэхнічны інстытут.

Працоўную дзейнасць пачаў канструктарам Спецыялізаванага канструктарскага тэхналагічнага бюро з доследнай вытворчасцю Інстытута фізікі Акадэміі навук БССР.

З 1977 года — вядучы інжынер Мінскага філіяла Маскоўскага канструктарска-тэхналагічнага бюро, пасля — вядучы канструктар Асобага канструктарскага бюро «Імпульс» Міністэрства радыёпрамысловасці СССР.

З 1981 па 1997 год працаваў у навукова-вытворчым аб'яднанні «Планар» Міністэрства электроннай прамысловасці СССР, дзе прайшоў шлях ад вядучага інжынера да кіраўніка аб'яднання.

З 1997 па 2002 год — намеснік і першы намеснік Міністра прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

З 2002 па 2003 год — старшыня Камітэта па навуцы і тэхналогіях пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

З 2003 па 2009 год — міністр прамысловасці Рэспублікі Беларусь.



У снежні 2009 года А.М. Русецкі быў прызначаны на пасаду дырэктара Інстытута цепла- і масаабмену імя А.В. Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а ў снежні 2010 года — на пасаду старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

25 верасня 2012 года выбраны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь пятага склікання ад горада Мінска, 19 кастрычніка — намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Доктар тэхнічных навук, прафесар, вучоны ў галіне электроннай тэхнікі. Пад яго кіраўніцтвам створана новае пакаленне оптыка-механічнага, зборачнага і кантрольна-вымяральнага абсталявання для субмікронных вытворчасцяў.

Аўтар больш як 70 навуковых работ, мае 13 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі (1996).

Узнагароджаны медалямі, ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

■ Прамая лінія

## ЗЯМЕЛЬНЫЯ ЎЧАСТКІ, ЧЭКІ «МАЁМАСЦЬ», АФАРМЛЕННЕ СПАДЧЫНЫ І ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

**Усе гэтыя тэмы былі ўзняты падчас «прамой лініі» ў рэдакцыі нашага выдання з удзелам старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгія Іванавіча Кузняцова. Нашымі чытачамі было зададзена больш за 40 пытанняў. Прапануем адказы на самыя актуальныя з іх.**

***— Мая сям'я жыве ў двухпакаёвай кватэры ў якасці наймальнікаў. У народзе ходзяць розныя чуткі аб такім жыллі. Адкажыце, ці хутка будзе даражэць прыватызацыя кватэр і зямельных участкаў?***

**Алена МІКАЛАЕЎНА,** *г. Мінск.*



— Падзелім ваша пытанне на дзве часткі. Што тычыцца кватэр. Гэта пытанне знаходзіцца ў кампетэнцыі мясцовых выканкамаў. Таму аб кошце прыватызацыі кватэр вам лепш звярнуцца па тлумачэнні ў адміністрацыю вашага раёна ў жыллёвы аддзел.

Падыходы да передачы ва ўласнасць зямельных участкаў, якія тычацца аплаты, мяняцца не будуць. Плата за такую прыватызацыю зямлі ажыццяўляецца ў памеры кадастравага кошту ці ў памеры, які вызначаецца на падставе кадастравага кошту зямельнага ўчастка. Для шматдзетных сем'яў зямельныя ўчасткі перадаюцца ў прыватную ўласнасць без аплаты ў тых выпадках, калі такія сем'і маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У асобных выпадках кошт прыватызацыі зямельных участкаў можа складаць да 50 працэнтаў ад кадастравага кошту гэтай зямлі. Гэта так, але... Нагадаю, што кадастравы кошт зямельных участкаў у пэўных рэгіёнах пераглядаецца прыкладна раз у 5 гадоў. А вось пры гэтай пераацэнцы будзе адпаведна мяняцца і кадастравы кошт саміх участкаў і цана выкупу іх у прыватную ўласнасць. Так, пасля пераацэнкі пэўныя ліквідныя землі па кадастравай ацэнцы стануць каштаваць значна даражэй.

У гэтым выпадку трэба спачатку высветліць, ці неабходна вам набыццё зямельнага ўчастку менавіта ў прыватную ўласнасць. Пасля вырашэння гэтага пытання вам неабходна звярнуцца ў мясцовую землеўпарадкавальную службу, дзе ўдакладніць аб магчымай пераацэнцы ці аб канкрэтных лічбах кадастравага кошту зямлі. СТАР 2

### КОРАТКА

Беларускае грамадства гатова да прымянення самых жорсткіх мер у дачыненні да нецвярозых кіроўцаў. Такое меркаванне выказаў старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Аляксандр Занімон. Па статыстыцы, прыкладна 15% (каля 500) ДТЗ, учыненых у Беларусі з пачатку года, адбылося па віне п'яных кіроўцаў. У выніку больш за 120 чалавек загінулі, больш за 550 атрымалі раненні.

Рыбагадоўчыя арганізацыі Беларусі зніжаюць цэны на жывую сажалкавую і азёрнарачную рыбу. Да 10 лістапада розанічныя цэны на жывую рыбу будуць зніжаны на 10%. Такім чынам, новы кошт карпа складзе ад 24,9 тыс. да 31,9 тыс. рублёў за 1 кг у залежнасці ад групы, белага амура — ад 28 тыс. да 32 тыс., таўсталобіка — ад 22,5 тыс да 26,9 тыс., карася — ад 14,9 тыс. да 20,9 тысяч.

ISSN 1990 - 763X

## ТАРЫФЫ НА ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў 2016 ГОДЗЕ НАБЛІЗЯЦЦА ДА ЎЗРОЎНЮ 100 ПРАЦЭНТАЎ КАМПЕНСАЦЫІ ЗАТРАТ

**Аб гэтым заявіў на пасяджэнні Электраэнергетычнага савета СНД у Мінску першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Тарыфная палітыка прадугледжвае паступовае набліжэнне тарыфаў на электраэнергію для насельніцтва да фактычных затрат. У 2016 годзе гэтыя тарыфы плануецца наблізіць да ўзроўню 100 працэнтаў кампенсацыі», — сказаў Уладзімір Сямашка.

Сёння ўзровень кампенсацыі па электраэнергіі складае 30,9 працэнта, па цеплавой энергіі — 16,8 працэнта, па газу — 29,1 працэнта.

«Такая задача стаіць, гэта прапісана ва ўсіх базавых дакументах, у тым ліку ў стратэгіі развіцця Беларусі ў цэлым, і мы да гэтай задачы прыйдзем», — падкрэсліў Уладзімір Сямашка. Гэта істотна палепшыць эканоміку энергасістэмы, дасць магчымасць ёй далей эфектыўна развівацца, канстатаваў першы віцэ-прэм'ер.

## БЕЛАРУСЫ ЗАВАЯВАЛІ ДРУГОЕ ЗОЛАТА НА ЧЭМПІЯНАЦЕ СВЕТУ ПА ПАЖАРНА-ВЫРАТАВАЛЬНЫМ СПОРЦЕ

Беларусы заваявалі другое золата на VIII чэмпіянаце свету па пажарна-выратавальным спорце, які праходзіць 18-20 кастрычніка ў турэцкай Анталі, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў МНС Беларусі.

«Учора завяршыліся спаборніцтвы па пераадоленні 100 м з перашкодамі. Па выніках дзвюх спроб не было роўных зборнай Беларусі — наша каманда паказала бліскучыя вынікі, і справядлівы вынік — агульнакамандн ае першае месца ў гэтым відзе праграмы», — расказаў прэс-сакратар МНС Віталь Навіцкі. Ён адзначыў, што беларус Уладзімір Стральчэня «паказвае проста фантастычна высокія вынікі». У двухборстве выратавальнікаў (сумуюцца вынікі ўздыму на 4-ы паверх вучэбнай вежы + 100 м з перашкодамі) спартсмен устанавіў новы сусветны рэкорд. Трэцяе месца ў двухборстве ў яшчэ аднаго беларуса — Максіма Шапарова.


БПС-СБЕРБАНК

**ОАО «БПС-Сбербанк» информирует об установлении по срочным банковским депозитам физических лиц следующего размера процентов:**

**- с 22.10.2012 по вновь привлекаемым депозитам в белорусских рублях: «Приумножай»**

| | |
|---|---|
| **Срок привлечения депозита** | 33 дня |
| **Размер процентов (годовых)** | 35% |
| **Процентная ставка** | Фиксированная в течение срока депозита |
| **Минимальная сумма депозита** | 5 000 000 рублей |

**- с 24.10.2012 по вновь привлекаемым и переоформляемым депозитам в иностранной валюте:**

| Наименование депозита /сумма вклада | Размер процентов (годовых) по срокам привлечения | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 90-189 дней | 190-369 дней | 370-500 дней | 501-750 дней | 751-1000 дней |
| **«Сохраняй»** | | | | | |
| от 100 до 1 000 USD/ EUR от 3 000 до 30 000 RUB | 4,0 | 4,6 | 5,1 | 5,5 | 5,8 |
| от 1 000 до 5 000 USD/ EUR от 30 000 до 150 000 RUB | 4,2 | 4,8 | 5,3 | 5,7 | 6,0 |
| от 5 000 до 20 000 USD/ EUR от 150 000 до 600 000 RUB | 4,5 | 5,1 | 5,6 | 6,0 | 6,3 |
| от 20 000 USD/EUR от 600 000 RUB | 4,9 | 5,5 | 6,0 | 6,4 | 6,7 |
| **«Пополняй»** | | | | | |
| от 100 до 1 000 USD/ EUR от 3 000 до 30 000 RUB | 3,9 | 4,5 | 5,0 | 5,4 | 5,7 |
| от 1 000 до 5 000 USD/ EUR от 30 000 до 150 000 RUB | 4,1 | 4,7 | 5,2 | 5,6 | 5,9 |
| от 5 000 до 10 000 USD/ EUR от 150 000 до 300 000 RUB | 4,3 | 4,9 | 5,4 | 5,8 | 6,1 |
| от 10 000 до 20 000 USD/EUR от 300 000 до 600 000 RUB | 4,5 | 5,1 | 5,6 | 6,0 | 6,3 |
| от 20 000 до 50 000 USD/EUR от 600 000 до 1 500 000 RUB | 4,7 | 5,3 | 5,8 | 6,2 | 6,5 |
| от 50 000 USD/EUR от 1 500 000 RUB | 4,9 | 5,5 | 6,0 | 6,4 | 6,7 |
| **Наименование депозита / неснижаемый остаток** | | | | | |
| **«Управляй»** | | | | | |
| 500 USD/EUR, 15 000 RUB | 3,3 | 3,9 | 4,4 | 4,8 | 5,1 |
| 1 000 USD/EUR, 30 000 RUB | 3,5 | 4,1 | 4,6 | 5,0 | 5,3 |
| 5 000 USD/EUR, 150 000 RUB | 3,8 | 4,4 | 4,9 | 5,3 | 5,6 |
| 20 000 USD/EUR, 600 000 RUB | 4,2 | 4,8 | 5,3 | 5,7 | 6,0 |

**- по депозитам в иностранной валюте, прием которых прекращен:**

| Наименование депозита | Срок привлечения | Размер процентов (годовых) | |
|---|---|---|---|
| | | доллары США, евро | российские рубли |
| **«Настоящий выбор»** | 370 дней | до 5 тыс. – 4,0<br>от 5 до 10 тыс. – 4,25<br>от 10 тыс. – 4,5 | до 150 тыс. – 4,0<br>от 150 до 300 тыс. – 4,25<br>от 300 тыс. – 4,5 |
| **«Динамичный»** | 3 года | 4,5 | 4,5 |

**Устанавливаемый размер процентов применяется:**

- с 24.10.2012 к вновь заключаемым и автоматически продлеваемым договорам срочных банковских депозитов в иностранной валюте «Сохраняй», «Пополняй», «Управляй», к переоформляемым с 24.10.2012 договорам срочных банковских депозитов в иностранной валюте «Динамичный» и «Настоящий выбор»;

- с 24.11.2012 к заключенным и автоматически переоформленным до 24.10.2012 договорам срочных банковских депозитов в иностранной валюте «Сохраняй», «Пополняй», «Управляй», «Динамичный» и «Настоящий выбор».

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по номеру **148** в стационарной и мобильных сетях.

Проценты, выплаченные по депозитам в течение 2011 г. (млрд. руб.): январь – 16,4; февраль - 16,0; март – 18,1; апрель – 16,2; май – 22,7; июнь – 23,3; июль – 23,9; август – 29,0; сентябрь – 30,4; октябрь – 44,6; ноябрь – 50,5; декабрь – 56,5.

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.10.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»*

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ШЫМОН ПЕРЭС ПА ТЭЛЕФОНЕ АБМЕРКАВАЛІ РАЗВІЦЦЁ ДВУХБАКОВЫХ АДНОСІН БЕЛАРУСІ З ІЗРАІЛЕМ

**Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Дзяржавы Ізраіль Шымонам Перэсам, у ходзе якой былі абмеркаваны актуальныя пытанні развіцця двухбаковых адносін, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Кіраўнік беларускай дзяржавы аднавіў Прэзідэнту Ізраіля запрашэнне наведаць нашу краіну, прымеркаваўшы візіт да юбілею ізраільскага лідара, які будзе ў наступным годзе», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Шымон Перэс у ходзе размовы падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за дапамогу ў лячэнні высокапастаўленага прадстаўніка Ізраіля.

## МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ АБМЕРКАВАЎ З МІНІСТРАМ ЭНЕРГЕТЫКІ РАСІІ ПЕРСПЕКТЫВЫ ПАСТАВАК ЭНЕРГАРЭСУРСАЎ У БЕЛАРУСЬ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч абмеркаваў учора ў Мінску на сустрэчы з міністрам энергетыкі Расіі Аляксандрам Новакам перспектывы паставак энергарэсурсаў у Беларусь.**

Кіраўнік урада прапанаваў абмеркаваць пытанні паставак нафты ў чацвёртым квартале і на 2013 год. Пры гэтым ён адзначыў, што ў Беларусі прыняты ўжо асноўныя прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на будучы год. Абедзве палаты парламента зацвердзілі бюджэт 2013 года, цяпер ён знаходзіцца на разглядзе ў Прэзідэнта. «Мы закладвалі даволі вялікія аб'ёмы ў бюджэт, у тым ліку і па нафтахімічным комплексе, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — У нас гэта не проста нафтаперапрацоўка, гэта поўны тэхналагічны цыкл, хімія». Таму гэта тэма бачыцца даволі актуальнай.

Прэм'ер-міністр пры гэтым падкрэсліў, што цяпер «няма ніякіх пытанняў, звязаных з купляй электраэнергіі». Ён падкрэсліў, што з Міністэрствам энергетыкі Расіі беларускі бок заўсёды імкнецца падтрымліваць канструктыўныя адносіны. «Хацелася б, каб добрыя, даверныя адносіны захаваліся», — сказаў Міхаіл Мясніковіч, звяртаючыся да новага міністра энергетыкі Расіі. Ён павіншаваў яго з назначэннем на пасаду кіраўніка Электраэнергетычнага савета СНД.

Пры гэтым прэм'ер падкрэсліў важнасць і асаблівасць адносін Беларусі з Расіяй. «Для Беларусі Расія — гэта многае, гэта больш, чым двухбаковыя адносіны, гэта брацкія адносіны, — сказаў ён. — Як ні кажы, як ні ажыццяўляй дыверсіфікацыю рынку, усё роўна рынак Расіі для нас прыярытэт, вялікая ёмістасць, тут нармальна выбудоўваюцца розныя гандлёва-лагістычныя схемы. Думаю, у энергетыцы гэта таксама прысутнічае».

**БЕЛТА.**

## ПАСТАНОВА
### Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**Аб выбранні Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Выбраць Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанку Уладзіміра Паўлавіча.

**Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь В. ГУМІНСКІ**

*18 кастрычніка 2012 г., г. Мінск.*
*№ 6-П5/1*

## ПАСТАНОВА
### Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**Аб выбранні намесніка Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

Выбраць намеснікам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Гумінскага Віктара Аляксандравіча.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. Андрэйчанка**

*18 кастрычніка 2012 г., г. Мінск.*
*№ 7-П5/1*

## «БЕЛАЯ РУСЬ» СТАЛА ПАЗІТЫЎНАЙ АСНОВАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ КРАІНЫ

**Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» за 5 гадоў сваёй гісторыі стала пазітыўнай асновай грамадзянскай супольнасці краіны. Пра гэта заявіў старшыня «Белай Русі» Аляксандр Радзькоў, выступаючы на пашыраным пасяджэнні Рэспубліканскага савета арганізацыі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Стварэнне і дзейнасць РГА «Белая Русь» дазволіла яшчэ больш цесна згуртаваць прэзідэнцкую большасць. За 5 гадоў сваёй гісторыі «Белая Русь» стала пазітыўнай асновай грамадзянскай супольнасці краіны. Гэта пацвярджаецца цікавасцю, імкненнем міжнародных і замежных арганізацый наладзіць з намі кантакты і сувязі, шматлікімі просьбамі аб супрацоўніцтве. Павышаная цікавасць праяўляецца да «Белай Русі» па ўсіх пытаннях грамадскага і палітычнага жыцця», -- сказаў Аляксандр Радзькоў.

Гаворачы аб выніках работы Рэспубліканскага савета, старшыня аб'яднання падкрэсліў, што за гэтыя гады «Белая Русь» імкнулася стварыць пазітыўны імідж аб'яднання ў вачах насельніцтва краіны, заручыцца падтрымкай грамадзян. «Найбольш дзейсным механізмам інфармавання людзей аб дзейнасці арганізацыі з'яўляюцца праводзімыя ёю мерапрыемствы і акцыі. Напрыклад, «Белая Русь» — з любоўю да дзяцей!» і «Белая Русь» ўпрыгожвае Беларусь!», а таксама іншыя акцыі. Аднак, рэалізуючы нашы сацыяльныя праекты, нам не варта падмяняць дзейнасць дабрачынных арганізацый і прафсаюзаў. Для гэтага ў нас няма ні рэсурсаў, ні сродкаў. Ды і гэта не з'яўляецца нашай статутнай задачай», — адзначыў Аляксандр Радзькоў.

Падчас пашыранага пасяджэння Рэспубліканскага савета «Белай Русі», якое праходзіла ўчора ў Мінску, былі падведзены вынікі работы савета за 5 гадоў, а таксама абмеркаваны новая рэдакцыя статута і праграмы аб'яднання і прынята рашэнне аб унясенні іх у парадак дня чарговага II з'езда «Белай Русі».

## Банкі Беларусі адзначаюць прыток сродкаў насельніцтва ў тэрміновыя ўклады

**Беларускія банкі адзначаюць прыток сродкаў насельніцтва ў тэрміновыя банкаўскія ўклады. Іх аб'ём за студзень—верасень 2012 года павялічыўся на Br16, 6 трл., або амаль на 40%, паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка па выніках пашыранага пасяджэння праўлення Нацбанка 19 кастрычніка ў Горках.**

«Ва ўмовах стабілізацыі эканамічнай сітуацыі ўзмацніўся прыток сродкаў насельніцтва ў тэрміновыя банкаўскія ўклады. Іх аб'ём за студзень—верасень 2012 павялічыўся на 16, 6 трлн рублёў (на 39,3%). У тым ліку тэрміновыя рублёвыя дэпазіты насельніцтва выраслі на 45,8 % (на Br4, 3 трлн). Тэрміновыя валютныя дэпазіты насельніцтва папоўніліся на 36% (на $1,4 млрд)», — адзначылі ў Нацбанку.

У гэтым годзе ўзрос попыт на крэдытаванне банкамі эканомікі ў нацыянальнай валюце. Калі ў першым квартале рублёвыя патрабаванні банкаў да эканомікі павялічыліся на 2,6%, за другі квартал — на 5,8%, то ў трэцім квартале — на 11,1%. За дзевяць месяцаў яны выраслі на 19, 7 трлн рублёў (на 20,6%). Рост крэдытавання ў замежнай валюце застаецца на стабільна высокім узроўні.

## «САВЕТ РЭСПУБЛІКІ ЗАЙМАЕ НАЙВАЖНЕЙШАЕ МЕСЦА Ў ПАЛІТЫЧНАЙ СІСТЭМЕ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Не сакрэт, што некаторыя нашы нядобразычлівыя называюць Савет Рэспублікі нібыта залішнім элементам або штучнай надбудовай у сістэме беларускай улады, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Аднак само жыццё паказала — толькі дзейнічаючы разам, абедзве нашы палаты стварылі эфектыўны парламент, які служыць народу і захоўвае стабільнасць, мір і спакой у грамадстве».

Як адзначыў Прэзідэнт, Савет Рэспублікі выконвае ролю свайго роду палітыка-прававога «фільтра», калектыўнага эксперта ўжо прынятых дэпутатамі законапраектаў. «Гэта выключна важная, можна сказаць, прынцыповая рэч, — падкрэсліў беларускі лідар. — Вы павінны, ідучы ад жыцця, ад практыкі, адказаць на пытанне — ці прынясе той ці іншы закон рэальную карысць людзям і краіне? Ці рэальна выканаць гэты закон?»

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, цяпер у Палаце прадстаўнікоў рыхтуецца да разгляду каля 50 праектаў законаў. «Так што ў працу давядзецца ўключацца з першага дня», — заўважыў, звяртаючыся да сенатараў, беларускі лідар.

Сярод прыярытэтных напрамкаў заканатворчай дзейнасці кіраўнік дзяржавы назваў эфектыўную эканоміку і сацыяльную палітыку. Новаму складу парламента трэба будзе працягнуць працу па ратыфікацыі міжнародных дагавораў, заключаных у рамках Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП). Таксама важная праца сенатараў у напрамку развіцця міжнародных сувязяў і міжпарламенцкіх кантактаў.

«Энергічныя і прадуманыя міжнародныя кантакты па парламенцкай лініі могуць і павінны даваць велізарную практычную аддачу і па прасоўванні нашых тавараў, і па інвестыцыях, і па ўмацаванні іміджу Беларусі. Працуйце з тымі, хто паважае наш народ, прызнае наш суверэнітэт і гатовы выбудоўваць з намі адносіны на роўных, — наказаў Прэзідэнт. — А гэта большасць краін свету — і брацкая Расія, і вялікі Кітай, Індыя, высокаразвітыя ўсходнеазіяцкія дзяржавы, багатыя арабскія краіны, Венесуэла, уся Лацінская Амерыка і Афрыка. Для актыўнага і плённага парламенцкага ўзаемадзеяння вельмі важныя вашы асабістыя кантакты з замежнымі калегамі».

Яшчэ адно важнае прызначэнне Савета Рэспублікі — сувязь з рэгіёнамі.

«Вы абраныя дэпутатамі мясцовых Саветаў і менавіта таму асабліва востра павінны адчуваць тое, як жывуць і развіваюцца вобласці, раёны, аграгарадкі, пасёлкі і вёскі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама лічыць неабходным развіваць і ўдасканальваць у краіне мясцовае самакіраванне.

«Сітуацыя ў краіне ўжо даўно стабільная і кіруемая. Наша грамадства дастаткова пасталела для таго, каб развівацца далей, у тым ліку і ў плане стымулявання, падтрымкі мясцовай ініцыятывы грамадзян. Па сутнасці, мясцовае самакіраванне — гэта і ёсць аснова дэмакратыі», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

**ДАВЕДКА**

***У новым складзе Савета Рэспублікі захавалася пераемнасць: з 57 сенатараў 17 парламентарыяў працавалі ў папярэднім скліканні.***

Адзін з найважнейшых напрамкаў работы сенатараў, на думку беларускага лідара, — узаемадзеянне з насельніцтвам. «Парламентарыям трэба весці прамую размову з людзьмі, прыслухоўвацца да думкі грамадзян, улічваць іх жыццёвыя патрэбы. Работа сенатараў павінна быць бачная ў рэгіёнах. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі даюць масу магчымасцяў для яе асвятлення. Нараўне з дзяржаўнымі СМІ неабходна шырэй выкарыстоўваць інтэрнэт-рэсурсы».

«Савет Рэспублікі разам з Прэзідэнтам у самыя крытычныя моманты прымае самыя важныя рашэнні. Вы пра гэта павінны памятаць. Гэтым усё сказана, — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. — Самае галоўнае — кожны з прысутных тут павінен адчуваць сябе адказным за краіну і дабрабыт беларускага народа».

**СПІКЕРАМ ВЕРХНЯЙ ПАЛАТЫ ПАРЛАМЕНТА АБРАНЫ АНАТОЛЬ РУБІНАЎ**

У ходзе пасяджэння **Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі 5-га склікання** сенатары выбралі **Анатоля Рубінава,** які ўзначальваў верхнюю палату парламента папярэдняга склікання. **Яго намеснікам — старшыню прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Анатоля Русецкага.**

Зноў выбраць Анатоля Рубінава старшынёй верхняй палаты парламента прапанаваў член Савета Рэспублікі Аляксандр Косінец. Анатоль Рубінаў у сваю чаргу запэўніў, што на пасадзе Старшыні Савета Рэспублікі працягне рабіць усё, каб парламент займаў годныя пазіцыі як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне. Падчас свайго выступлення ён акрэсліў уласнае бачанне найважнейшых задач для Савета Рэспублікі новага склікання.

Паводле слоў Анатоля Рубінава, сенатараў чакае вялікая праца па ўдасканаленні нацыянальнага заканадаўства, развіцці міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. Ён таксама звярнуў увагу парламентарыяў на неабходнасць актыўнага ўзаемадзеяння з мясцовымі Саветамі дэпутатаў, авалодання навыкамі вядзення «парламенцкай дыпламатыі».

На думку Старшыні Савета Рэспублікі, павінны стаць больш плённымі і зносіны сенатараў са СМІ: «Голас сенатара павінен гучаць у СМІ. Трэба, каб мы больш актыўна выказвалі сваю пазіцыю па актуальных пытаннях, не адмоўчваліся, але і не ператваралі гэта ў «гаварыльні».

Акрамя таго, Анатоль Рубінаў не выключае, што членам верхняй палаты трэба будзе прааналізаваць выбарчае заканадаўства Беларусі, прапанаваць далейшыя варыянты развіцця парламента ў краіне. «Сёння ў нас мажарытарная выбарчая сістэма. Нам трэба будзе абмяркоўваць, саспелі мы ці не для змены выбарчай сістэмы (у прыватнасці, пераходу да змешанай сістэмы, каб частка парламентарыяў выбіралася па партыйных спісах)», — сказаў Анатоль Рубінаў.

«Я пастараюся, каб мы працавалі без лішняга піяру, пустога скалынання паветра, але спакойна, па-дзелавому, і каб ад нас была карысць», — рэзюмаваў Анатоль Рубінаў.

Учора таксама былі выбраны **старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі**

Па рашэнні сенатараў у Савеце Рэспублікі захаваецца ранейшы пералік пастаянных камісій: па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, па эканоміцы, бюджэце і фінансах, па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Пастаянную камісію Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве ўзначаліла Лілія Мароз, якая з'яўлялася ў мінулым скліканні намеснікам старшыні гэтай камісіі. Старшынёй Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах абраны Уладзімір Панцюхоў — старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў. Старшынёй Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці стаў Мікалай Казаравец — рэктар Беларускага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта. Пастаянную камісію па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ўзначаліла Святлана Герасімовіч — старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. Старшынёй Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы сенатары выбралі Уладзіміра Сянько, які шмат гадоў працаваў на дыпламатычнай рабоце.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

## ЗЯМЕЛЬНЫЯ ЎЧАСТКІ, ЧЭКІ «МАЁМАСЦЬ», АФАРМЛЕННЕ СПАДЧЫНЫ І ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Як я зразумела, пакуль не плануецца павялічваць кошт прыватызацыі зямлі?***

— Змяненне падыходаў пры выкупе зямлі ва ўласнасць не плануецца. А вось пераацэнка кадастравага кошту зямельнага масіву ў вашым месцы можа быць. Пераацэнка ажыццяўляецца па заказе адпаведнага выканкама.

☎ ***— На якіх умовах і калі можна будзе атрымаць зямельны ўчастак пад індывідуальнае будаўніцтва ў межах гарадоў-спадарожнікаў нашай сталіцы?***

**Алег Лапацін,** *г. Мінск.*

— Вакол горада Мінска выканкамам пастаўлена задача падбіраць свабодныя зямельныя масівы, якія будуць прыгодныя для індывідуальнага будаўніцтва. Аднак... Трэба разумець, што той жа Мінскі раён небезразмерны. Тая колькасць асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, якая стаіць у чарзе на атрыманне зямельных участкаў, сведчыць аб тым, што попыт на зямлю ў прысталічным рэгёне даволі істотны. Вам трэба спачатку дакладна вызначыцца з пытаннем, у якім канкрэтна месцы хочаце мець зямельны ўчастак.

**Падыходы перадачы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць грамадзян мяняцца не будуць. Такі выкуп зямлі можа падаражэць пасля пераацэнкі саміх зямельных масіваў. Кадастравы кошт зямельных участкаў пераглядаецца прыкладна раз у 5 гадоў. Пераацэнка зямель робіцца па ініцыятыве мясцовых улад.**

Пасля гэтага ваш алгарытм дзеянняў будзе наступным. Калі вы маеце патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, то трэба звярнуцца ў адпаведны сельвыканкам для пастаноўкі на зямельную чаргу. Ёсць пастанова ўрада № 1781, якая вызначае адзіныя падыходы пастаноўкі на ўлік. Гэта першы варыянт вырашэння вашага пытання.

Можна пайсці і іншым шляхам. На сайтах выканкамаў і на сайце Дзяржкаммаёмасці акумулюецца інфармацыя аб аўкцыёнах па продажы зямельных участкаў прыватным асобам. Там існуе даволі вялікі выбар зямельных участкаў, якія прапануюцца на продаж. Па гэтым варыянце набыць зямельныя ўчасткі можна значна хутчэй. Таму, калі ў вас ёсць свабодныя грошы, лепш ісці па гэтым шляху.

***— А ці будзе вакол гэтых гарадоў-спадарожнікаў зроблена інжынерная інфраструктура?***

— Так, мясцовыя выканкамы павінны забяспечыць раёны індывідуальнай забудовы адпаведнай інжынернай інфраструктурай. Разам з тым, бываюць выпадкі, калі з гэтым не ўсё так добра. Удакладняць гэтае пытанне лепш непасрэдна на месцы. Адно магу сказаць упэўнена, што да заканчэння будаўніцтва аб'ектаў індывідуальнага сектара ўся неабходная магістральная інфраструктура (дарогі, падключэнне электрычнасці і г.д.) павінна быць падведзена.

☎ ***— Добры дзень. Наша сям'я ў 2010 годзе ўступіла ў кааператыў, каб будаваць сабе кватэру. Амаль адначасова нам, як чаргавікам, прапанавалі атрымаць зямельны ўчастак пад індывідуальнае будаўніцтва. Дакументы на зямлю намі былі аформлены і накіраваны 3 студзеня 2011 года ў мясцовы сельсавет. Рашэння аб выдзяленні нам зямельнага ўчастка так і не было, бо... Пачаў дзейнічаць указ кіраўніка дзяржавы аб тым, што, калі будуеш кватэру, то зямельны ўчастак ужо атрымаць будзе нельга. Аднак у сельсавеце па нашай справе рашэння так і няма. Мясцовыя спецыялісты цалкам не разабраліся ў нашай сітуацыі...***

**Спадарыня Алеся,**
*Мінскі раён, п. Багатырова.*

— Сітуацыя цалкам зразумелая. Вам, як асобам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, дзяржава дае на выбар два шляхі вырашэння жыллёвай праблемы. Калі вы пачалі будаваць кватэру ў шматкватэрным доме, то прапанаваць вашай сям'і яшчэ і зямельны ўчастак пад індывідуальнае будаўніцтва ўжо нельга. Пра гэта канкрэтна гаворыцца ва Указе Прэзідэнта Беларусі № 565. Таму мясцовы выканкам павінен прыняць канчатковае рашэнне па вашай справе, а не зацягваць яе больш чым на год. Каб усё ж вырашыць гэтую праблему, я параю вам звярнуцца з запытам у раённы выканкам. Так будзе хутчэй.

☎ ***— Задам пытанне ад маёй мамы. У нас у Гомельскай вобласці ад бабулі засталася хата ў вёсцы. Мы туды наведваемся 1—2 разы ў год. Дом не лепшы, але месца цудоўнае, бо гэта ж Петрыкаўскі раён. Што нам зараз рабіць, каб дом з участкам не забрала мясцовая ўлада, бо мы там не жывём?***

**Аляксей Бяляеў,** *г. Мінск.*

— А вы гэты дом у спадчыну афармлялі ўжо? Ён зараз ужо зарэгістраваны ў агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі? Зямельны ўчастак аформлены?

***— Дакладна не ведаю. Мабыць, аформлены.***

— У першую чаргу вы павінны разабрацца з гэтым. Спадчыннікам неабходна на працягу шасці месяцаў звярнуцца ў натарыяльную кантору і прыняць спадчыну. Пасля гэтага натарыяльная кантора выдае пасведчанне аб праве на спадчыну. З гэтым пасведчаннем, калі дом не быў аформлены бабуляй, неабходна звярнуцца ў сельскі Савет для афармлення дакументаў на зямельны ўчастак і на дом. Калі ўсё гэта зрабіць і ў спадчыннікаў ёсць дакументы і на зямельны ўчастак, і на дом, то далей вам лепш падаць заяву ў мясцовы сельсавет, каб абазначыць прыналежнасць такой нерухомасці менавіта вам. У гэтай заяве неабходна ўдакладніць, што дом і зямельны ўчастак вы будзеце выкарыстоўваць і далей. У гэтым выпадку пытанняў да гэтай нерухомасці з боку мясцовых улад не будзе.

Калі падобных дакументаў на дом і ўчастак няма, то трэба пачынаць з натарыуса. Неабходна ўдакладніць, ці адкрыта яшчэ спадчынная справа, што з тэрмінамі на яе афармленне і г.д. Зараз у сельскай мясцовасці існуе спрошчаны парадак афармлення спадчынных правоў на такія домікі і зямельныя ўчасткі.

***— Але мы там даволі рэдка бываем...***

— Гэта не з'яўляецца падставай для таго, каб адбіраць у вас домік і зямельны ўчастак. Галоўнае, каб усё было аформлена, самі аб'екты выкарыстоўваліся і плаціліся падаткі. Каб участак і дом былі ў нармальным стане — вось тады праблем не будзе.

☎ ***— У мяне пытанне аб прыватызацыйных чэках «Маёмасць». Ці магчыма гэтыя паперкі абмяняць на акцыі нейкіх прадпрыемстваў? Ці можна іх зараз прадаць?***

**Сяргей Каваленка,** г. Брэст.

— Чэкі «Маёмасць» можна абмяняць на акцыі акцыянерных таварыстваў. Вам трэба звярнуцца ў Беларусбанк. Там існуюць пералікі акцыянерных таварыстваў, акцыі якіх магчыма абмяняць на прыватызацыйныя чэкі. Такія пералікі пастаянна абнаўляюцца. Тэрмін дзеяння чэкавай прыватызацыі вызначаны заканадаўствам да 1 ліпеня 2013 года. Магчыма, што гэты тэрмін будзе яшчэ падоўжаны.

**Зямельны ўчастак і дом, дзе працяглы час ніхто не жыве, мясцовыя ўлады адбіраць не маюць права. Галоўнае, каб такая нерухомая маёмасць была зарэгістравана, плаціліся адпаведныя падаткі, а ўчастак і дом былі ў нармальным стане.**

***— У мяне ёсць яшчэ адно пытанне. Яно такое... глабальнае. Шмат гавораць пра прыватызацыю з удзелам насельніцтва, аднак... Ці плануецца прыватызацыя сапраўды буйных знакавых прадпрыемстваў? У гэтым выпадку ці будзе магчыма набываць акцыі і простым людзям, напрыклад, акцыі «Беларуськалія» за чэкі «Маёмасць»?***

— Як толькі будзе прынята адпаведнае рашэнне па канкрэтным буйным прадпрыемстве, то адразу насельніцтва аб гэтым праінфармуюць.

Мерапрыемствы па продажы акцый кшталту народнага IPO, як гэта было зроблена на Мінскім заводзе пеністых він, плануюцца і ў далейшым.

Галоўныя падыходы пры прыватызацыі буйных прадпрыемстваў у нашай краіне вызначаны. Неабходна шукаць інвестараў, новых эфектыўных уласнікаў.

☎ ***— Добры дзень, Георгій Іванавіч. Мы шматдзетная сям'я. У нас у Мінску ёсць уласная двухпакаёвая кватэра. Памяшканне невялікае, таму сталі ў чарзе асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Ці маем мы магчымасць атрымаць зямельны ўчастак непасрэдна ў сталіцы або ў прыгарадзе для будаўніцтва свайго дома? Куды нам трэба звяртацца і колькі гэта будзе каштаваць?***

**Таццяна Глінская,** *г. Мінск.*

— Такое права ў вас ёсць. Каб атрымаць зямельны ўчастак у сталіцы, вам трэба звяртацца ў мясцовую адміністрацыю гарвыканкама. Па Мінскім раёне — у той сельскі Савет, дзе вы жадаеце атрымаць участак. Гэта так, але...

Трэба ўлічваць той факт, што ў Мінску існуе павялічаны попыт на зямельныя ўчасткі, а свабодных зямель тут амаль не засталося. Вас запішуць у дзеючую чаргу па зямельных участках, дзе неабходна будзе чакаць свайго часу. Магчыма, што і даволі доўга.

Наконт таго, дарага ці танна гэта. Шматдзетным сем'ям зямельныя ўчасткі выдзяляюцца без аплаты. Заплаціць неабходна будзе толькі за афармленне дакументаў па стварэнні землеўпарадкавальнай справы і за ажыццяўленне дзяржаўнай рэгістрацыі гэтага аб'екта нерухомасці.

***— Ёсць яшчэ дадатковае пытанне. У майго сваяка ўласная кватэра ў Баранавічах. Цяпер ён жыве за Мінскай кальцавой дарогай у інтэрнаце. Зарэгістраваны там ужо тры гады. Ці мае права мой сваяк атрымаць зямельны ўчастак у Мінскім раёне пад будаўніцтва індывідуальнага жылля?***

— Ваш сваяк мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, калі ўлічваць і кватэру ў Баранавічах?

***— Не. Там кватэра вялікая.***

— У Мінскім раёне зямельныя ўчасткі могуць атрымліваць без аўкцыёнаў толькі тыя сем'і, якія стаяць у чарзе асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Усе астатнія катэгорыі насельніцтва павінны набываць зямельныя ўчасткі толькі на адпаведных аўкцыёнах або на другасным рынку зямлі. Інфармацыя аб аўкцыёнах размешчана на адпаведных сайтах выканкамаў. Добры сайт ёсць у Мінскім раёне. Шмат інфармацыі існуе на афіцыйным сайце Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. Там існуе адзіная база, дзе акумулюецца ўся інфармацыя аб зямельных аўкцыёнах (адрас правядзення, час і ўмовы).

☎ ***— Я звяртаюся да вас па даручэнні індывідуальных забудоўшчыкаў на тэрыторыі Чысцінскага сельскага Савета. Нам тры гады таму далі зямельныя ўчасткі для будаўніцтва індывідуальнага жылля. Ці павінен наш сельсавет ажыццяўляць добраўпарадкаванне гэтых тэрыторый (неабходна правесці электрычнасць, пракласці дарогу да ўчасткаў, пракласці лініі водазабеспячэння і каналізацыі)? Нам сёлета ў маі неабходна здаваць індывідуальныя дамы ў эксплуатацыю, бо людзі бралі ў банках буйныя крэдыты...***

**Наталля Юрчанка,** *пасёлак Чысць Маладзечанскага раёна.*

— Так. Ваш выканкам абавязаны забяспечыць гэты зямельны масіў неабходнай магістральнай інфраструктурай. Такую інфраструктуру неабходна правесці ў тэрмін да здачы ў эксплуатацыю жылых дамоў на гэтых зямельных участках. Гэтыя абавязкі выканкамаў прапісаны ва Указе Прэзідэнта Беларусі № 72, які тычыцца менавіта інфраструктуры. Таму ад мясцовых улад вы можаце патрабаваць выкананне гэтых нормаў.

***— Мы ўжо звярталіся са сваімі праблемамі ў мясцовы сельсавет, а пасля — і да раённых спецыялістаў у Маладзечна. Там нам паабяцалі правесці сёлета толькі водазабеспячэнне. А што будзе з электрычнасцю? Кажуць, што ў раёна на гэта няма грошай...***

— Тады вам трэба звяртацца са скаргай у аблвыканкам. Грошы на інфраструктуру павінны быць запланаваны.

***— А ці магчыма такую заяву ў аблвыканкам накіраваць па электроннай пошце?***

— Вы маеце рацыю. На сайце кожнага дзяржаўнага органа існуе прыёмная. Туды можна накіраваць ваш калектыўны зварот ад забудоўшчыкаў. Чыноўнікі абавязкова павінны рэагаваць і на такія заявы грамадзян.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне будзе.)*

■

## АБЗАЦ

◢ **Мінскі планетарый 20 кастрычніка правядзе Дзень астраноміі. Усе ахвотныя змогуць бясплатна паглядзець у тэлескоп, паслухаць навукова-папулярныя лекцыі, наведаць фотавыставу касмічных здымкаў. Мінскі планетарый размешчаны ў дзіцячым парку імя Горкага. Глядзець у тэлескоп можна будзе ад 17:00 да 22:00.**

◢ Пад Гродна прычэп, які адарваўся ад «КаМАЗа», стаў прычынай гібелі сям'і з трох чалавек. Страшнае ДТЗ адбылося ў в. Каробчыцы. У бок Гродна рухаўся «МАЗ». Нечакана ў яго адчапіўся прычэп і выехаў на паласу сустрэчнага руху. Прычэп урэзаўся ў Volkswagen Passat, за рулём якога знаходзілася жанчына, а ў салоне — яе 14-гадовая дачка, маці і цётка. Маці, дачка і бабуля загінулі на месцы, чацвёртая пасажырка (сястра кіроўцы) знаходзіцца ў рэанімацыі.

◢ **Супрацоўнікі мінскай міліцыі затрымалі збытчыкаў спайсу. Маладыя людзі прадавалі свой тавар проста на стадыёне аднаго са сталічных каледжаў. Іх патэнцыйнымі пакупнікамі павінны былі стаць студэнты і падлеткі. Былі затрыманы двое маладых непрацуючых мінчан. Пры асабістым аглядзе ў іх знайшлі 68 падрыхтаваных для рэалізацыі пакецікаў з псіхатропам.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ У Батумі (Грузія) урачыста адкрылі вежу-фантан, адкуль замест вады будзе біць чача — вінаградная гарэлка. Мясцовыя жыхары і журналісты назвалі гэты экзатычны аб'ект Чача-Таўэрам. Адкрыў фантан мэр сталіцы Аджарыі Леван Варшаламідзэ. "Усе ахвотныя, нашы гараджане, замежныя госці або турысты будуць мець магчымасць пакаштаваць чачу", — запэўніў ён. Між тым традыцыйная грузінская гарэлка не будзе "ліцца ракой" — яна будзе падавацца ў фантан замест вады раз на тыдзень і ўсяго на 15 хвілін. Будаўніцтва Чача-Таўэра вышынёй 25 м было прафінансавана мэрыяй Батумі і абышлося амаль у паўмільёна долараў. У інфраструктуру вежы ўваходзіць таксама інфармацыйны цэнтр, 4 адкрытыя басейны і іншыя аб'екты. Задума разлічана на прыцягненне турыстаў. Кожны раз з фантана будзе ліцца чача розных вытворцаў, што стане для іх своеасаблівай рэкламай.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## ВАКЦЫНА ПАДАЕ З НЕБА
### Трымайцеся далей ад зоны палётаў

**Дзяржаўнае прадпрыемства "Беллесавія" праводзіць работы па вакцынацыі дзікіх жывёл з дапамогай спецыяльных прынад, якія раскідваюцца з самалётаў. Выкарыстанне авіяцыі пры імунізацыі, у адрозненне ад раскідвання прынад уручную, што практыкавалася яшчэ нядаўна, дае большы эфект, бо забяспечвае раўнамернае пакрыццё і поўны ахоп усёй тэрыторыі, якая падлягае апрацоўцы.**

Блістар-прынады з вакцынай раскідваюцца з паветраных бартоў на тэрыторыі Мінскай, а таксама Гродзенскай і Віцебскай абласцей уздоўж мяжы з Літоўскай Рэспублікай. "Беллесавія" задзейнічала для гэтага самалёты "АН-2" з аэрадрома Хожава Маладзечанскага раёна. Прынады з вакцынай раскідваюцца з разліку 23 адзінкі на адзін квадратны кіламетр тэрыторыі. Самалёты ляцяць з хуткасцю 150-180 кіламетраў у гадзіну на вышыні 150-200 метраў. У мэтах бяспекі людзям, якія апынуліся ў месцах правядзення такіх работ, трэба трымацца на адлегласці ад зоны палёту, каб пазбегнуць траўмавання прынадамі з вакцынай. Яны ўяўляюць сабой брыкеты шэрага ці цёмна-карычневага колеру масай да 30 грамаў, выраблены з кампанентаў кармоў, што ядуць драпежныя жывёлы, са спецыфічным пахам. Пры выпадковым пападанні вакцыны (змесціва блістару) на адкрытыя ўчасткі цела ці слізістыя абалонкі вока, рота ці носа іх неабходна прамыць вадой, апрацаваць 2-працэнтным растворам пітной соды і звярнуцца ў мясцовую ўстанову аховы здароўя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Борисовком райисполкоме (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже одноэтажного кирпичного здания материального склада, инвентарный номер 610/С-41294, об.пл. 816,4 кв.м., расположенного по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Углы, ул. Октябрьская, 5. Начальная цена – 498 871 800 бел.руб. Площадь земельного участка 0,6036 га (предоставлен ДУП «ПМК-199» на праве аренды по 08.07.2042г. Ограничения в использовании: 0,0442 га – охранная зона ЛЭП свыше 1000 вольт). Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона на расчетный счет организатора торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Объект обременен договорами аренды. Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 11.09.2012. Аукцион состоится **05.11.2012** в 12.00 по адресу: Минская обл., **г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.11.2012** до 17.00 по адресу: **г.Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 324. Тел: (8017) 224-61-34; 500-47-12.**

■ Кропка на карце

# АХ, ЯК ХОЧАЦЦА ВЯРНУЦЦА...



**Дзякуючы папулярнай песні ў выкананні Анжэлікі Варум, якая стала «гімнам» не менш папулярнай праграмы «Гарадок», адным з самых вядомых беларускіх гарадоў стаў менавіта Гарадок Віцебскай вобласці. Хоць у самім Гарадку ніхто не лічыць, што менавіта іх гарадок натхніў аўтараў шлягера.**

### ЧЫМ СУСТРЭЎ ГАРАДОК

Прыемна здзівіла, што ў Гарадку не афішуюць свае праблемы. Толькі і чуў ад мясцовых жыхароў, што ўсё ў іх добра. На гербе Гарадка — леў. Герб, дарэчы, вядомы з XVI стагоддзя. Леў, сімвал мужнасці і храбрасці тутэйшых воінаў, на фоне залацістага поля...

Кінулася ў вочы, што ўсе гарадскія фантаны не працавалі — «адключылі на прафілактыку». Хацеў убачыць славутую гарадоцкую крыніцу, каб напіцца, ды тутэйшыя не параілі. Паводле іх слоў, яна ператварылася ў «бруднае месца». Пацвярджэннем былі адпаведныя фота, якія мне паказалі на мабільным тэлефоне. Жыхары Гарадка патлумачылі, што мясцовыя камунальнікі, вядома, маглі б навесці парадак, як, напрыклад, зрабілі гэта ў парку, дзе любяць адпачываць мамы з дзецьмі. Ды, паводле іх слоў, крыніца «не была замацавана за сістэмай ЖКГ». Падчас экскурсіі па гарадку Гарадку (прабачце за таўталогію), назіраў, як рабочыя старанна ствараюць пешаходную зону. На жаль, у райцэнтры захавалася мала будынкаў дарэвалюцыйнага часу, але ж парачка ёсць. Напрыклад, аптэка, пабудаваная ў 1906 годзе. Ці былая паштовая станцыя, пабудаваная ў XIX стагоддзі...

Пакуль хадзіў па пешаходнай вуліцы, кінулася ў вочы мясцовая «Дошка ганьбы» ў чаканні партрэтаў «герояў», якія не хочуць спраўна плаціць за камунальныя паслугі. Дарэчы, ці маюць рацыю тыя, хто гэта прыдумаў: выставіць дошку ў самым цэнтры горада? Як той казаў, ёсць пытанне. Не ў сярэднія ж вякі жывём. Было б, напэўна, цікавей тут прачытаць пра вядомых выхадцаў з Гарадка, убачыць турыстычныя схемы. А так... Калі ласка — Вася, Пеця, Коля (з прозвішчамі), якія не плацяць за электрычнасць, ваду і гэтак далей.

### І САРАФАНЫ-«ВІЛАЧКІ»

У Гарадоцкім раённым Доме рамёстваў і фальклору здзівіліся нечаканаму візіту карэспандэнта. Але ж паказаць тое, што ствараюць майстры, не адмовіліся. Слова «фальклор» у назве ўстановы падкрэслівае асаблівасць гэтага дома. У штаце ёсць спецыяльны метадыст, які займаецца менавіта фальклорам. У Доме працуюць 12 гурткоў: ёсць і па ганчарстве, і па ткацтве паясоў... Славуты гарадоцкі пояс у свой час быў вядомы не меней за слуцкі. Больш шырокія вітыя паясы насілі мужчыны, вузкія — жанчыны і дзеці. Майстрыха Наталля Леанідаўна Юшкова аднавіла тэхніку вырабу пояса па старадаўнім узоры. Арыгіналы былі знойдзены падчас экспедыцыі па вёсках. Марына Леанідаўна Гушча аднавіла ажурнае ткацтва, якое нарадзілася менавіта ў Гарадоцкім раёне. Цікава, што пра майстроў з Гарадка ведаюць не толькі ў блізкім замежжы, але і ў далёкай Венесуэле. Там пабывала адна з майстрых у складзе беларускай дэлегацыі.



На жаль, працуюць людзі з залатымі рукамі не ў самых лепшых умовах. Дом рамёстваў размешчаны ў будынку, пабудаваным у дарэвалюцыйны час. Як расказала маці адной з дзяўчынак, якія наведваюць гурток, тут няма ні каналізацыі, ні водаправода, ні цэнтралізаванага ацяплення. Саграваюць памяшканні ў халады старыя печы. І толькі адна з іх працуе нармальна. Дзецям як у такіх умовах займацца? Каб рукі памыць пасля, напрыклад, лепкі трэба пачакаць, пакуль з калодзежа прынясуць вады. Ваду падагрэюць — тады дадуць памыцца. У памяшканнях зімой холадна...

Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» 1 ноября 2012 г. с 10.00 до 10.50.

| Сведения о недвижимом имуществе | | | Информация о земельном участке | | Размер задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб. | Площадь, га | Срок аренды, лет | |
| Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (здание детского сада) с подвалом двухэтажное, кирпичное, 1173,8 кв.м | Могилевская обл., Кировский р-н, Стайковский сельсовет, дер. Чигиринка, ул. Садовая, д. 12 | 993 089,626 | 0,3146 | 50 | 190 000,0 |

Земельный участок предоставляется победителю (единственному участнику) аукциона в аренду без взимания платы за право заключения договора аренды.

Условия для победителя (единственного участника) аукциона в отношении земельного участка, необходимого для обслуживания недвижимого имущества:

в случае изменения целевого назначения объектов недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение соответствующего райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет;

осуществить строительство (реконструкцию) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; обеспечить соблюдение установленных статьей 77 Водного кодекса Республики Беларусь и иными законодательными актами запретов и ограничений хозяйственной и иной деятельности в связи с расположением земельного участка в водоохранной зоне Чигиринского водохранилища.

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Полная информация об условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Звязда» 23 августа 2012 г.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до его проведения, при этом объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 10 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, на счета получателей, указанные в протоколе аукциона.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат. При уклонении одной из сторон от заключения договора купли-продажи недвижимого имущества или договора аренды земельного участка другая сторона вправе обратиться в суд с требованием о понуждении заключить договор, а также о возмещении убытков, причиненных уклонением от его заключения. Договор аренды земельного участка и возникновение основанного на нем права аренды подлежат государственной регистрации в соответствии с законодательством.

Оплата за недвижимое имущество осуществляется денежными средствами по безналичному расчету в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества. Покупателю по его письменному заявлению может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества с ежемесячной индексацией платежей.

Информация об объектах, предлагаемых к продаже, размещена на сайтах Могилевского областного исполнительного комитета **region.mogilev.by** и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by**.

2012 ГОД КНІГІ

# Дзіцячае пытанне

**Што такое добра, а што такое дрэнна?.. Чаму адзін учынак добры, а іншы — дрэнны? І хто гэта вырашае?.. Вось асабліва на гэтае, апошняе пытанне мне дагэтуль бывае складана даць адказ адной вельмі няўрымслівай дзяўчынцы. Яна хоць і падрасла, але часам ставіць у тупік, калі даць адказ, здаецца, немагчыма. Ды і яна можа не паверыць на слова — усё думае, што гэта толькі яе так павучаюць. А патлумачыць жа трэба. І як добра, што ў такія моманты можна сказаць: а ты пачытай, вось тут усё напісана... І калі ўсё ж слухае і бярэ ў рукі кнігу, то вынік бывае нечаканы і для яе, і для дарослых, якія на яе глядзяць у гэты момант: як жа гэта цікава!..**

У сучасных дзяцей, як і ў сучасных дарослых, спакус шмат: асобныя тэлеканалы з гадзінамі мультфільмаў ці фільмаў, камп'ютарныя гульні, дзе можна завісаць суткамі. А колькі варыянтаў цацак! Але як бы ні забаўлялі дзіця, яму ўсё роўна рана ці позна захочацца зразумець, чаму дабро заўсёды перамагае зло. А пра гэта лепш за ўсё распавядаюць казкі, якія расказваюць дзеткам мамы. Невыпадкова адна з кніг, якая сёлета ўбачыла свет, так і называецца «Маміна казка (выд. «Літаратура і Мастацтва»). Кніжка аказалася паспяховай: у яе ўвайшлі беларускія народныя казкі разам з рускімі народнымі. Магчыма, большасці цяперашніх бацькоў і бабуль з дзядулямі самім патрэбны момант параўнання і прыняцця беларускіх казачных персанажаў, каб потым прасцей было патлумачыць дзецям, што ў кожнага народа ёсць свае казкі. І гэта натуральна: спасцігаць свет згодна з традыцыямі, якіх прытрымліваўся ўвесь род. У кожнага народа ёсць свае героі, якія дапамагаюць разабрацца ў самых розных сітуацыях і зрабіць з іх свае высновы. У кожнага народа ёсць свае сімвалы, вобразы, праз якія можна наладзіць масток паміж ледзь уяўным светам дзіцячых фантазій і рэчаіснасцю. У кожнага народа ёсць свае словы, якія лепш за ўсё кладуцца на адчуванне рэчаў і з'яў.

— Зараз ёсць попыт на дзіцячую кнігу як на рускай, так і на беларускай мове, — запэўнівае **Вераніка МАРУК, супрацоўніца выдавецтва «Літаратура і Мастацтва»**. — Дзіцячая літаратура разыходзіцца вельмі добра. Гэта не год, не паўгода, а пытанне некалькіх месяцаў. Кнігі запатрабаваныя і ў бібліятэках, і ў крамах краіны. Калі ў Мінску просяць кнігі і на рускай, і на беларускай мове, то ў абласных і раённых гарадах вельмі запатрабаваныя беларускамоўныя кнігі.

Удакладню: мяне цікавяць не падручнікі, выданне якіх, напэўна, таксама можна аднесці да ліку кніг для дзяцей. І не толькі серыя кніг «Школьная бібліятэка», калі выдаюцца творы пісьменнікаў, якіх праходзяць па праграме ці ў пазакласным чытанні.

Таму што наўрад ці правільна, калі дзіцячая кніга на беларускай мове будзе асацыявацца толькі з навучаннем. Дзецям важна, каб яна несла асалоду і радасць. У пошуках такой кнігі я прайшла некаторыя сталічныя крамы — і, ведаеце, прапаноў не шмат. Можа, сапраўды разыходзяцца адразу? Вывучыла прапановы інтэрнэт-крам, дзе сёе-тое можна набыць. Знайшла навінкі, якія выпусцілі айчынныя выдавецтвы ўжо сёлета. Вось жа ў «Мастацкай літаратуры» — проста дапаможнік для бацькоў, якім патрэбныя калыханкі ці трапныя выразы для выхавання дзетак: «Дзе Купала начавала». Ды яшчэ ў густоўным мастацкім афармленні Ганны Салівончык. Укладальніца гэтай кнігі, **пісьменніца Алена МАСЛА** — чалавек, апантаны стварэннем менавіта дзіцячых кніг — працуе ў выдавецтве і ведае, чаму зламіць добрую дзіцячую кнігу бывае не проста:

— Я не падтрымліваю размоў, што няма беларускай кнігі, няма беларускай дзіцячай літаратуры. Яна ёсць, яе спачатку трэба проста пабачыць. Але калі яе няма дзе набыць, то, можа быць, і таму, што дзіцячыя кніжкі сёння вельмі хутка разыходзяцца. І насамрэч вельмі шмат людзей хочуць мець кнігу на беларускай мове: нехта выхоўвае дзяцей па-беларуску. Ды ўсё-такі ж мы ў Беларусі жывём. Беларуская мова — родная, да яе людзі цягнуцца, нават калі яна можа быць у пасіве, таму і кніжкі для дзетак на беларускай мове купляюць. Што тычыцца нашага выдавецтва, то мы стаім на абароне беларускамоўнай дзіцячай кнігі. У нас з'явіліся вельмі цікавыя праекты. Можа, іх пакуль не столькі, колькі хацелася б, але мы шукаем беларускіх аўтараў. Ёсць пэўныя праекты, калі мы прадумваем, што хацелі б бачыць кнігу на канкрэтную тэму ў сябе. Тады мы замаўляем яе канкрэтнаму аўтару, ведаючы, што ён можа яе напісаць. У нас так рабілася кніга «Кветкі» — фотаздымкі Паліны Грынчанкі найбольш распаўсюджаных у Беларусі кветак (васількі, рамонкі, бэз і гэтак далей) і да іх вершы Алены Церашковай. Ёсць вельмі цікавы аўтар, палеантолаг, навуковец Юрась Заіка. Мы замовілі яму кнігу пра тое, што было на тэрыторыі Беларусі мільярды гадоў таму. Гэта ўжо працуе маркетынгавая палітыка: адчуваеш, чаго нестае на рынку, знаходзіш людзей, якія напішуць пра гэта. Вядома, нягледзячы на ўсю прастату размовы з дзецьмі, пісаць для іх — вельмі складаная праца. Таму людзей, якія ўмеюць для дзяцей пісаць, не так і шмат. Але цікавыя імёны ёсць: Генадзь Аўласенка, Раіса Баравікова, пісьменнікі старэйшага пакалення Мікола Чарняўскі, Мікола Маляўка, Уладзімір Ліпскі. З'яўляюцца і новыя імёны. Выйшла ў нас кніга Людмілы Ціняковай «Прыгоды летняга лугу». Гэта аўтарка з Гомеля, наша адкрыццё. Яна сталы чалавек, але гэта яе першая кніга. Ёсць музыкант Уладзіслаў Бубен, які распачаў серыю кніг «Марцін і кацяня» для самых маленькіх. Гэта мілыя гісторыі, якія пішуцца для багата ілюстраванай кнігі.

Дзіцячая кніга — гэта яшчэ і выхавацель густу. Таму ў ёй важныя абодва аўтары: той, хто напісаў словы, і той, хто іх паказаў у вобразах. А дзеці ж спачатку заўважаюць вокладку, глядзяць карцінкі, а пасля ўжо чытаюць. Таму ёсць пэўныя правілы, згодна з якімі падаецца дзіцячая кніга: яна павінна быць яркай, але з даступнымі, зразумелымі ілюстрацыямі. Каб зайчык быў зайчыкам, а лісічка — лісічкай. Гэта сусветная тэндэнцыя: дзіцячая кніга павінна быць з класічным дзіцячым малюнкам.

Найбольш паспяховымі дзіцячымі праектамі становяцца багата ілюстраваныя. Дзякуючы афармленню і прыгожым фотаздымкам адразу раскупляюцца пазнавальныя кнігі, укладальнікам якіх з'яўляецца Алесь Бадак, прысвечаныя раслінам, птушкам, жывёлам. Заўсёды карыстаюцца попытам «Лясная кніга», «Блакітная кніга», «Чырвоная кніга» і «Касмічная кніга». У іх уваходзілі творы беларускіх пісьменнікаў пра лес, пра ваду, пра расліны і жывёлы, якія занесеныя ў Чырвоную кнігу, пра космас. Карысныя і патрэбныя веды таксама можна набываць праз казку, як гэта робіць гераіня кнігі «Вавёрка піша сачыненне». У сучасных беларускіх дзяцей з'яўляюцца — так і павінна быць — свае казачныя персанажы. І няхай гэта будуць Баравічок на скутары, ці Зязюля-гулюля, альбо вясёлыя парсючкі Брык і Шуся. Раіса Баравікова, якая апошнім часам паспяхова працуе ў дзіцячай літаратуры, умее прыдумваць цікавых персанажаў з беларускім, родным каларытам: ад касмалёту па імені Дранік фантазія прывяла да прыгод у Беларусі міжпланетнага пажарніка і іншых мамурыкаў. Персанаж «мамурык» — ад слова «мама»...

Калі паглядзець па найменнях кніг, якія выпускаюць выдавецтвы для дзяцей, — ёсць з чаго выбраць. Але сітуацыя такая, што пры ўсёй напружанай і добрай працы выдавецтваў патэнцыйны чытач, нават той, які гэтыя кнігі чакае, можа іх не ўбачыць. Таму што выдавецтвы сёння ведаюць, што такое маркетынг і імкнуцца працаваць так, каб сваю прадукцыю хутка прадаць. Бывае, увесь наклад імгненна разыходзіцца, а потым людзі, якія не паспелі набыць кнігу адразу, думаюць, як і дзе яе можна знайсці. У той жа «Мастацкай літаратуры» месяц як выйшла кніга «Я — чалавек», накладам 2500 асобнікаў, яе ўжо няма: бібліятэкі расхапалі. Таму людзі, якія маюць уяўленне пра сённяшнюю дзіцячую беларускую кнігу, вельмі шкадуюць, што часам не паспяваюць ці не маюць магчымасці яе набыць.

Наклады кніг у 1000, 1500, 2000, напэўна, рынкава абгрунтаваныя: выдавецтвам жа не хочацца рызыкаваць і рабіць кнігі, якія не разыходзяцца. Але калі ўзяць пад увагу, што колькасць патэнцыйных чытачоў дзіцячых кніг усё-такі можа быць больш за мільён (у залежнасці ад колькасці дзяцей), то, натуральна, далёка не да ўсіх патэнцыйных спажыўцоў новая дзіцячая кніга можа патрапіць, нават з улікам бібліятэк. «У апошні час ёсць такая тэндэнцыя, што мы паціху павялічваем наклады», — гаворыць Вераніка Марук.

Але тут для выдавецтваў ёсць пэўная рызыка, таму што ўступаюць у гульню ўмовы сённяшняй выдавецкай дзейнасці. Гэта ўсё-такі бізнэс, які абкладваецца падаткамі. Адпаведна, павышаюцца выдаткі, а кошт кнігі, асабліва дзіцячай, не можа быць бязмежны. Таму застаецца спадзявацца на тое, што дзяржава зразумее, у чым яе дзяржаўны інтарэс у сувязі з выданнем кніг для дзяцей і зробіць нейкую палёгку ў гэтым працэсе...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

---

Наш культурны асяродак

# Жырандоля

Выпуск № 34 (164)

**ТЭАТР можна палюбіць аднойчы: паглядзець адзін спектакль, які пераверне душу і выкліча катарсіс, каб потым чакаць і шукаць гэтага ад іншых пастановак. А потым усё адно ўзгадваць той самы «свой» спектакль, які назаўсёды зрабіў цябе заўзятым тэатралам.**

## НАШ ВЫХАД!

Магчыма, у кагосьці гэта здарылася падчас міжнароднага тэатральнага форуму «Тэарт», які даў магчымасць гледачам Беларусі, якія добра ведаюць нашы тэатры, пазнаёміцца з тэатрам іншым. З тым, які прыязджае з іншых краін — бо для таго, каб лепш бачыць і ацэньваць сваё, трэба ведаць сучасны сусветны кантэкст развіцця тэатральнага мастацтва. З тым, які сёння можа паказаць тое, чаго мала ў беларускім тэатры: эксперыменту, новага духу, новых формаў. З тым, які мяняе цябе, а праз цябе імкнецца ўдасканальваць свет.

Быць у кантэксце сучаснага тэатра вельмі складана. Гэта не кіно, якое сёння можна паглядзець на любых носьбітах, дзе табе трэба і калі трэба. Гэта не музыка, якую таксама можна набыць на дысках, скачаць у фармаце МР3, а то і пайсці на канцэрт, калі прыязджаюць выдатныя музыканты на гастролі. Гастролі тэатраў бываюць рэдка — нятаннае гэта задавальненне. Як і паездкі кудысьці — толькі дзеля таго, каб паглядзець нейкі нашумелы ў нейкай краіне спектакль, наўрад ці гэта будзеш рабіць. А на дыску ці ў запісе — зусім не тое адчуванне. А вось такія праекты, як фестываль «Панарама» ці «Тэарт», пашыраюць магчымасці беларускіх тэатралаў. Тым і каштоўныя.

«Тэарт» змяніў свой фармат — і гэта выдатна. Тыдзень змяніўся некалькімі тыднямі тэатральнага жыцця. Пашырыліся геаграфія, колькасць удзельнікаў. Да спектакляў, якія адзначаны расійскай «Залатой маскай», далучыліся пастаноўкі, створаныя ў блізкіх для нас краінах і не вельмі. І мы ўбачылі, што сучасны тэатр:

**Пластычны.** З дапамогай рухаў можна сказаць сур'ёзныя рэчы, як гэта ўдалося артыстам познаньскага Тэатра танца: у адной з дзвюх прывезеных у Мінск пастановак пад назвай «Мінус 2» яны здолелі ўзняць складаную тэму Халакосту, абыграўшы яе разам з залай, прымусіўшы тым самым кожнага адчуць сябе ў якасці ахвяры. І гэта рыса сучаснага тэатра — табе не проста паказваюць, цябе робяць часткай пастаноўкі.

**Інтэрактыўны.** Таму што гледача можна не толькі ўводзіць у дзею, але сам падзел паміж сцэнай і глядзельнай залай можна зрабіць умоўным, каб наогул яго не адчуваць. Так, напрыклад, вырашыў зрабіць літоўскі рэжысёр Оскарас Каршуновас у сваёй інтэрпрэтацыі п'есы Горкага «На дне», калі героі нібыта сядзелі ў начлежцы, але ж рэжысёр здолеў дабіцца адчування ў гледачоў, што і яны — частка гэтай начлежкі і вельмі проста могуць апынуцца на дне жыцця. Мяжа паміж табой удзельнікам і гледачом адсутнічае. Яшчэ і таму, што гэтаму спрыяў склад тых, хто быў на сцэне.

**Акцёрскі.** Акцёры ў сучасным тэатры павінны быць гатовы да ўсяго. Да самых складаных і неверагодных задач. Яны павінны ўмець паказаць любую эмоцыю — як акцёры таго ж Вільнюскага гарадскога тэатра. Нават часам ловіш сябе на адчуванні, што, можа, гэта і не акцёры — настолькі натуральныя людзі, якіх ты бачыш на сцэне. І калі іх яднае адна ідэя — размаўляць з сучасным гледачом на сучаснай мове і на мове сучаснага тэатра, то атрымліваецца як у артыстаў маскоўскага «Тэатр. Doc». Нязмушана і «па прыколе» разважаць аб праблемах пакаленняў, пра якія хто толькі не гаворыць, і нікуды ад іх не падзенешся — гэта частка актуальнай рэчаіснасці.

**Дакументальны.** Сучасныя акцёры сёння гатовы дзеля мастацтва, якім жывуць, сапраўды пускаць у сваю душу іншую істоту. Таму што жыццё — гэта людзі, з іх трагедыямі, людзі, якіх не зразумелі своечасова. Як у спектаклі «Персона. Мэрылін» варшаўскага тэатра імя Хлоўбка. Дакументальны кірунак — распавядаць пра рэальных асоб — прадстаўляў у Мінску эстонскі Рускі тэатр. Іх герой — Андрэй Таркоўскі, разам з якім у беларускага гледача была магчымасць перажыць «Адну летнюю ноч у Швецыі». Таркоўскі — асоба-наватар. А без наватарства няма руху ў мастацтве. Таму сучасны тэатр гатовы да любых эксперыментаў — фармальных ці сэнсавых. Ён гатовы да эксперыментаў нават тады, калі ў аснове спектакля ляжыць абсалютна класічная рэч.

**Літаратурны.** Расійскі рэжысёр Кірыл Сярэбранікаў сваёй здольнасцю эксперыментаваць выклікаў ужо столькі размоў ды скандалаў на радзіме. Але глядзець яго спектаклі трэба не з-за гэтага. Яго цікавіць сутнасць рэчаў. Сутнасць можна не толькі акрэсліць словамі, але зрабіць відавочнай. Відавочнасць неабавязкова павінна адпавядаць нашым уяўленням пра вядомыя словы. Калі ласка: «Мёртвыя душы Гогаля» ўвасобіліся зусім па-іншаму ў Латвійскім нацыянальным тэатры. Таму што літаратура ў Сярэбранікава — гэта толькі частка тэатральнай дзеі, якая працуе на ідэю — рэжысёрскую.

**Філасафічны.** Сучасны тэатр — гэта тэатр ідэі. Гэта тэатр з ідэяй. Тэатр дзеля ідэі. Дзеля чаго эстэтызм і прыгажосць карцінкі, якую бачыць глядач, калі няма сэнсу, які вынесе чалавек з тэатра? Таго сэнсу, які пераверне, можа быць, нечую свядомасць. Таму сучасны тэатр можа быць нават антыэстэтычным, але пры гэтым супергуманістычным па сваім глабальным пасыле. Гэта тое, што здолеў паказаць італьянец Рамэа Кастэлучы ў спектаклі «Аб канцэпцыі Вобраза Сына Божага». Гэта тое, чаго асабіста я ў тэатры не перажывала даўно. Гэта больш чым тэатр, таму заслугоўвае асобнай размовы...

Насамрэч міжнародныя тэатральныя праекты патрэбны менавіта таму, што тэатр не можа варыцца ў замкнёнай прасторы адной краіны. Краіны ж у сучасным свеце не існуюць адасоблена, людзі праз кіламетры могуць адчуваць нешта аднолькава, перажываць, пеставаць і адстойваць нейкія ідэі. Праз тэатр, які сёння існуе па-за межамі, людзі яднаюцца. У той час, як тэатр законсерваваны — раз'ядноўвае, у ім, здаецца, што б ні паставілі, — усё добра, губляецца адчуванне якасці, а глядач, які цягнецца да вяршынь супрацьпастаўлены таму, для якога паход у тэатральны буфет непадзельны ад сцэнічнай дзеі. Вядома, адно другога не выключае, але бывае такая прага тэатра, што спектаклі глядзяцца на адным дыханні, нават калі яны без перапынку, а сама дзея можаператварыць істоту, якая спажывае мастацтва ў чалавека, які думае над ім і гэтым сілкуецца. І чым больш беларуская тэатральная супольнасць будзе далучана да сусветных плыняў, тым больш мы будзем у сваіх тэатрах бачыць неадназначных, важных, кранальных пастановак з сучасным гучаннем. Цэнтр візуальных мастацтваў абяцае нам сёння яшчэ і першы ўласны эксперыментальны праект — «Ладдзя роспачы» паводле Караткевіча.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

---

# ГЭТА ЛЮБОЎ...

## Навошта Вобраз Божы ў сучасным спектаклі?



Мяне доўга і ўпарта забівалі. Спачатку кінулі адну гранату — выбух і нешта разляцелася... Потым другую, трэцюю. Яны ляцелі без перапынку, некалькі хвілін. І чым больш іх было, чым большай была атака на выяву, у якую яны ляцелі, тым больш відавочным было адчуванне — гэтыя дзеці на сцэне іх кідаюць у мяне. Жудаснае адчуванне, скажу вам. Невыноснае...

Гэта была ўжо другая частка спектакля італьянскага мастака Рамэа Кастэлучы. Спектакль, які выклікаў самыя неадназначныя водгукі ў свеце. Усё, што я чытала пра гэтую пастаноўку, было напісана з акцэнтам на скандальнасць, на выклік, на агіду і з самага пачатку пераканала мяне ў тым, што нельга ісці і глядзець такое. Аднак жаданне зразумець, з чым працуе тое самае сучаснае мастацтва, якое, да таго ж, можна было паглядзець толькі адзін дзень, перамагло. Я дала сабе слова: у самыя агідныя моманты буду заплюшчваць вочы.

Мне не прыйшлося гэтага рабіць. Нават у першай частцы. Мала таго, не было думкі ўстаць і сысці (як гэта бывае часам пры сустрэчы з дрэнным мастацтвам). Дзея заварожвала і інтрыгавала нават сваёй паўторнасцю. Рэспектабельная кватэра са стылёвай белай мэбляй. У цэнтры — вялікі мастацкі твор эпохі Адраджэння: выява Ісуса Хрыста. На канапе — дзед у белым халаце. Здаецца, выглядае рэспектабельна. Пакуль не прыходзіць яго сын: у строгім строі, з іголачкі, гатовы ісці можа на якія дзелавыя перамовы. Але той, што ў халаце, яго не адпускае: нешта здарылася. Сын падыходзіць, дапамагае ўстаць старому, які цяпер выглядае зусім нямоглым, здымае з яго халат, які ззаду ў брудных плямах, потым здымае брудны памперс... Прыносіць вядро, анучку, пачынае старога мыць. Вельмі ашчадна, з любоўю. А стары ўвесь час шапоча: «Прабач, прабач...». Пераапрануўшы яго ў чысты памперс і адзенне, сын садзіць яго ў спецыяльнае крэсла. І гатовы сысці. Але заўважае зноў непрыемнасць. Бацька плача. Сын зноў яго мые, пяшчотна, з клопатам выцірае, пераапранае. Але заўважае, што нямоглы бацька зноў увесь перапэцкаўся і пакідаць яго ў такім выглядзе нельга. Зноў сцэна паўтараецца. Малады чалавек з цярплівасцю і сыноўнім клопатам робіць сваю справу. І як жа ў яго хапае гэтай цярплівасці і любові?..

У нейкі момант здаецца, што ўжо і не хопіць. Калі стары ў страце розуму перапэцквае прыгожы белы ложак. І тады сына пакідаюць сілы. Ён ідзе да таго самага вобраза, які ўвесь гэты час быў на сцэне, прыхінаецца да яго і ціха бясконца паўтарае: «Ісус, Ісус, Ісус, Ісус...»

Сапраўды, у чалавечым жыцці бываюць сітуацыі выключнай чалавечай любові, якія б, здавалася, немагчыма выцерпець, без тых сіл, якія дае чалавеку любоў Боская. Напэўна, гэта разумелі ўсе ў зале — ніводзін чалавек не сышоў. А можа, і таму, што аўтар наўмысна ўзяў за аснову тую сітуацыю, у якой можа аказацца кожны чалавек — у адным ці ў другім становішчы.

Пасля спектакля Рамэа Кастэлучы на сустрэчы з гледачамі казаў пра тое, што насамрэч экскрэменты — гэта метафара. Метафара любові. Але навошта так часта паўтараць на сцэне гэтае падмыванне старога? І так усё зразумела. А для таго, каб можна было зразумець бясконцасць любові праз сітуацыю бясконцага выпрабавання. Сэнс любові — у бясконцасці. Яна не канчаецца. І калі б спектакль абмежаваўся толькі сцэнай бацькі і сына, гэтая метафара не адыграла б сваю ролю ў спектаклі.

Калі сцэну пакінулі ўсе героі, калі яе вызвалілі ад мэблі, у цэнтры застаўся вісець толькі твор — выява Ісуса. І тут дзяцей XX стагоддзя змянілі дзеці XXI-га. Падлеткі, выхаваныя без любові. Выява прыцягнула іх увагу.

Далей дзеці забівалі Бога. Яны, можа, не ведалі, хто Ён, ці проста гулялі. Яны кідалі ў яго гранаты. Тыя адляталі — а ён заставаўся некранутым. Ён вытрымаў. Дзеці сышлі. Але галоўнае пачалося пасля.

Твар Ісуса нібыта пакрыўся зморшчынамі, а потым счарнеў — ад гора, ад жаху. Калі зала засталася зусім у цемры. Чорнае палатно сарвалі — за ім адкрыліся літары, якія свяціліся ў цемры: «Ты ёсць мой пастыр». Яны свяціліся прыгожа, даючы надзею на тое, што, нават калі мы адварочваемся ад яго, ён нас не пакідае зусім. Але вось на імгненне ў зале запалілася штучнае святло — і надпіс ужо здаваўся трошкі іншым: побач са словам «ёсць» прыкметна чыталася «не». Пры штучным святле святло сапраўднае гарыць ужо не так ярка, і гэтым так лёгка спакусіцца. Але калі святло зноў пагасла, яркі надпіс застаўся гарэць надзеяй для кожнага.

Гэта сучасны тэатр, але ён больш, чым тэатр. Гэта мастацтва, у якім за радыкальнай, можа быць, формай схаваны глыбокі сэнс: дзе сёння месца Богу ў нашым жыцці? Напэўна, гэты спектакль прыдумаў чалавек, для якога Бог — гэта любоў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

---

# ТУМАН НАБЛІЖАЕЦЦА

## Віталь Чарвякоў расказвае, што быць у ролі дырэктара здымачнай групы фільма «У тумане» вельмі няпроста

**Стужку Сяргея Лазніцы «У тумане» паводле твора Васіля Быкава беларусы яшчэ не бачылі. Яна пакрыта туманам таямніцы і нечаканасці. Але ўжо хутка, на кінафестываль «Лістапад», які пройдзе ў Мінску з 2 па 9 лістапада, прыедзе і Сяргей Уладзіміравіч, і ўласна карціна. «У тумане», дарэчы, стане фільмам адкрыцця кінафестывалю. Сапраўды, чаго спаборнічаць, калі стужку і так узнагародзілі ўжо ў Канах прызам Міжнароднай Федэрацыі кінапрэсы ФІПРЭСІ?**



Грыміруюць дырэктара беларускай здымачнай групы фільма «У тумане» Віталя Чарвякова, які іграе ролю партызана.

Віталь Чарвякоў, дырэктар здымачнай групы са стажам, не толькі адказваў за арганізацыю здымак з беларускага боку, а нават выканаў эпізадычную ролю ў другім іграбым фільме Лазніцы. Для таго, каб працаваць над карцінай «У тумане», Віталь Анатольевіч пайшоў на паніжэнне, але зусім гэтым не выхваляецца. І пакуль мы з вамі ў прадчуванні «Лістапада», ён расказаў «Звяздзе», чаму Віцебшчыну здымалі ў Латвіі, што лічыцца маветонам на здымачнай пляцоўцы, навошта Лазніца прасіў беларусаў лаяцца матам і як яны зрабілі немагчымае.

**— Віталь Анатольевіч, як вы патрапілі на фільм «У тумане»?**

— «У тумане» — карціна, якая для ўсіх стала нечаканасцю, таму што дырэктары здымачных груп, каму прапаноўвалі працаваць на фільме, адмовіліся: складана, тэрмінаў няма... На час, калі запускалася карціна, я быў дырэктарам студыі іграбых фільмаў «Беларусьфільма». І калі ўсе дырэктары здымачных груп майго падраздзялення адмовіліся, я напісаў заяву, што хачу працаваць на фільме, і мне дазволілі. Знайшлі іншага чалавека на маю пасаду. Шчыра хачу сказаць, што ў шкуры дырэктара здымачнай групы вельмі няпроста, але неверагодна цікава.

**— Што ўваходзіла ў абавязкі дырэктара здымачнай групы?**

— Быў бюджэт, за рамкі якога я не павінен быў выйсці. Я павінен быў зрабіць каштарыс, вызначыцца з тэрмінамі, супрацоўнікамі, хто будзе ўдзельнічаць у працэсе стварэння фільма з беларускага боку. Так атрымалася, што 19 верасня 2011 года былі прызначаны здымкі ў Латвіі. А дагавор на ўдзел кінастудыі «Беларусьфільм» у гэтым праекце быў падпісаны 5 верасня. Менш чым за 15 дзён нам трэба было сабраць усю неабходную маёмасць кінастудыі і даставіць на месца здымак. У мяне атрымалася фура і дзве грузавыя машыны. На вываз гэтай маёмасці патрэбна было атрымаць дазвол ад Міністэрства культуры, Ваенна-прамысловага камітэта... Але спярша трэба было ўсё гэта сфатаграфаваць, пранумараваць, зрабіць вопіс, атрымаць дазвол, знайсці транспарт, аформіць візы. Калі мы прыехалі на здымкі, нас спачатку жудасна дакаралі, што, маўляў, мы ледзь не сарвалі здымкі і нас чакаюць ледзь не два месяцы. Але калі я патлумачыў, што дагавор падпісалі 14 дзён таму і мы за гэты час усё зрабілі, мне не паверылі. У беларускай камандзе было чалавек 15 (увогуле стандартная здымачная група складаецца недзе з 60 чалавек), нехта прыходзіў, нехта сыходзіў. Была наша брыгада асвятляльнікаў, два механікі здымачнай тэхнікі, мы прывезлі сваю здымачную апаратуру, оптыку, кран, вазкі. Амаль два месяцы ў верасні і кастрычніку здымалі восеньскі блок, потым на 8 дзён зімой, у студзені 2012 года, прыязджалі на здымкі зімовага блока. У агульным здымачных дзён было трохі больш за 30. Без уліку дзён падрыхтоўкі, пераездаў з аб'екта на аб'ект. Графік здымак быў настолькі шчыльны, што, бывала, мы па тры аб'екты здымалі за дзень. Адлегласць паміж аб'ектамі — недзе 30-40 кіламетраў. А гэта ўсё лясы, палі. За аснову ўзялі прыроду Віцебшчыны. А латвійская Латгалія вельмі падобна на наш Мёрскі край, Браслаўшчыну.

**— А чаму не здымалі ў Беларусі?**

— Па адной простай прычыне: мы не ўваходзім у Еўрапейскі фонд падтрымкі кінапраектаў Юрымаж (Eurimages). Таму грошы з Еўрасаюза, шэнгенскай зоны, вылучаныя на кіно, не могуць патрапіць у краіну, якая не ўваходзіць у гэтую зону. Латвія, якая ўваходзіць у Шэнгенскую зону, стала аптымальнай кропкай для здымак. Беларусы ў гэтай шматнацыянальнай камандзе (па падліках нямецкай прэсы, удзельнічалі спецыялісты 41 нацыянальнасці) вылучаліся прафесіяналізмам, працаздольнасцю... І чалавечымі якасцямі. Таму што кіно — гэта каласальная сумесная праца, падчас якой людзі становяцца як родныя.

**— Як атрымалася, што вы зняліся ў эпізадычнай ролі ў фільме «У тумане»?**

— Гэта здарылася падчас здымак зімовага блоку, таму хачу асобна расказаць пра зімовы перыяд здымак. Меркавалася, што мы павінны былі забяспечыць здымачную групу іграбым аўтатранспартам. Паколькі наш транспарт — гэта не рэпліканты, а сапраўдныя іграбыя машыны, якія лічацца рарытэтнымі, то вываз іх нават за межы кінастудыі — толькі з дазволу генеральнага дырэктара кінастудыі, а за межы рэспублікі наогул не абмяркоўваецца. А па сцэнарыі «палутарка» (грузавая машына часоў вайны), на якой паліцаі ездзяць, павінна ўзарвацца. Безумоўна, кінастудыя сваю машыну аддаць на такія справы не можа. Таму вырашылі зрабіць дакладную копію гэтай машыны без рухавіка. Таксама прывезлі яе на месца здымак. Да месца «ўзрыву» пад'ехала сапраўдная машына, спынілі камеру, падмянілі яе на копію без рухавіка, начынілі выбухоўкай, і ў кадры ўзарвалася копія. У апошні дзень зімовых здымак ці то акцёр не прыехаў, ці што, да мяне падыходзіць асістэнт рэжысёра і гаворыць, што Лазніца хоча, каб я сыграў адну невялічкую ролю. Акцёрскі вопыт у мяне ёсць, я пагадзіўся. Практычна ўвесь здымачны перыяд быў рэжым маўчання: нікога на пляцоўцы лішняга няма, ніякіх журналістаў, ніякіх інтэрв'ю, забаронена было фатаграфаваць нават на мабільныя тэлефоны. У апошні здымачны дзень запрасілі прэсу, і яны пачалі мяне фатаграфаваць: таго, хто здымаўся апошнім, хто застаўся на пляцоўцы, так бы мовіць.

**— Дык усё ж каго вы сыгралі?**

— Так не раскажаш, трэба глядзець. Сыходзіць з партызанскага атрада адзін з галоўных герояў, і яму ўслед крычыць партызан: «Ты там махорачкі не забудзь!» Вось і ўсё, невялічкая роля.

**— Ці былі нейкія адмысловыя правілы на здымачнай пляцоўцы ў Сяргея Лазніцы?**

— Ёсць адно правіла, яно дзейнічае на ўсіх пляцоўках: ніхто не мае права глядзець у рэжысёрскі манітор. У аператара ёсць свой экран, ён глядзіць, каб не было перасвету, там спецыяльныя прыборы, якія вызначаюць якасць будучай карцінкі. Рэквізітары сочаць, ці ўвесь рэквізіт стаіць на пляцоўцы на сваім месцы і г. д. Кожны заняты сваёй справай.



На здымачнай пляцоўцы «У тумане».

**— Які быў эмацыянальны стан на пляцоўцы? Усё-ткі з такой складанай тэмай працавалі...**

— З першага дня было адчуванне, што мы — адна сям'я. Немцы (яны ўклалі найбольшую частку грошай у фільм, і галоўны прадзюсар Хайна Дэкер — немец) наогул вельмі клапатліва ставіліся да ўсіх. Атмасфера была вельмі добразычлівая. Нямецкі распарадак, педантызм ва ўсім. У добрым сэнсе слова. Вось адпрацавалі мы 14 ці 16 гадзін. Немцы падыходзяць да начальніка пляцоўкі, кажуць: маўляў, 4 гадзіны пасля прыёму ежы прайшло, трэба есці. А там даздымаць трэба было кароткую сцэну. Прадзюсар прыкідвае, пакуль з'ездзяць у горад, возьмуць прадукты, вернуцца — пройдзе 2 гадзіны, атрымліваецца перапрацоўка. Ну, і спыняюць здымкі, чакаюць абеду. Здымачны дзень, увогуле, пачынаўся з таго, што ўсе дружна прыязджалі на пляцоўку, абвяшчаўся сняданак, усе разам снедалі. А таго, хто не паеў, на пляцоўку маглі і наогул не пусціць.

**— Часта, калі здымаюць нават самае сур'ёзнае кіно, на здымачнай пляцоўцы весела і лёгка. Як было з фільмам «У тумане»?**

— Праца была вельмі напружаная і сканцэнтраваная. Сяргей на пляцоўцы вельмі вытрыманы, спакойны. Я нядаўна даведаўся, што ён фізік-матэматык па першай адукацыі, працаваў з сур'ёзнымі сістэмамі. Гэта мае свой адбітак: у яго вельмі магутны аналітычны склад розуму. Ён шмат цікавага расказваў на пляцоўцы, кожны мог да яго звярнуцца. Але былі і вясёлыя моманты. Вось, напрыклад, у апошні здымачны дзень Лазніца сабраў беларускую групу, падзякаваў усім за працу, і тут падыходзіць гукааператар Уладзімір Галаўніцкі. Гаворыць, што яму не хапае аднаго гуку: прыглушанага рэха, як паліцаі лаюцца матам. І ўся беларуская група, пасля кансультацыі, якія канкрэтна словы трэба выкрыкваць, узлезла на ўзгорак і лаялася адтуль матам гадзіны паўтары, пакуль Галаўніцкі не запісаў патрэбнае рэха. Такая была смешная сцэна!

**— Калі загаварылі пра Уладзіміра Галаўніцкага... Не ведаеце, чаму Сяргей Лазніца на фестывалі «Залаты абрыкос» сёлета ўпарта называў яго літоўцам?**

— Напэўна, таму што Галаўніцкі даўно жыве ў Літве, шмат там працуе. Для яго, як для творцы, Беларусь стала маленькая. Калі ўзяць, напрыклад, праграму Канскага кінафестывалю за апошнія 10 гадоў, то, напэўна, у 8 з іх на многіх фільмах-прызёрах працаваў якраз наш беларускі гукааператар Уладзімір Галаўніцкі.

**— Віталь Анатольевіч, вы самі ўжо бачылі фільм «У тумане»?**

— Увесь цалкам яшчэ не бачыў. Мог паглядзець, калі ў нас на тон-студыі кінастудыі «Беларусьфільм» рабілі перазапіс, але вырашыў не псаваць першае ўражанне. Усё-ткі калі фільм глядзіш на вялікім экране, з добрым гукам, цалкам завершаны, ствараецца зусім іншае эмацыйнае ўражанне. А пару тыдняў таму на «Беларусьфільм» прыслалі беларускую копію фільма, якую вы пабачыце на «Лістападзе», і якая потым выйдзе ў пракат па ўсёй рэспубліцы.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**




Рубрыку вядзе Дунька ШЫП.

# НЕ ПРА МАГНІЦІК

*Гісторыйка*

Злуецца на мяне суседка. Без дай прычыны. Вось паслухайце.

У мяне ў спальні каля ложка тумбачка стаіць. У ёй дзверцы зламаліся. Магніцікам былі прымацаваны. Я такі магніцік купіла. Але ж хто паставіць? Муж у мяне ёсць, ды ён на працы ўвесь час.

А тут, бачу, сусед міма ідзе — з Веркаю (Верка — гэта жонка яго). Запыніла іх: хадземце, маўляў, нешта пакажу.

Зайшлі ў хату. У зале ў мяне тэлевізар уключаны: фільм нейкі ішоў. Там такое каханне паказвалі, што Сашка аж сеў. А мне ж карціць тумбачку адрамантаваць. Я і кажу: «Ты, Верка, калі хочаш, пабудзь тут, паглядзі, а мы з Сашкам у спальню пойдзем». Як схапіла Верка венік — ды мне па плячах: «Ах ты распусніца! Я табе пакажу, як чужога мужа ў спальню цягнуць!» Я крычу: «Верка, не трэба мне твой муж! Мне б толькі магніцік паставіць!» Тут яна яшчэ больш звар'яцела і пацягнула Сашку на вуліцу.

З той пары і тумбачка не зачыняецца, і Верка са мной не вітаецца.

**Ала ДЗІКАЯ,**
*Дзяржынскі раён, в. Узрэчча.*

## З НАРОДНАГА

### «НАБОЖНЫ» БАЦЬКА

— Пойдзем, кум, у царкву!

— Я не такі набожны, каб так часта хадзіць... От бацька мой, Божухна, спакой яго душачцы, быў надта набожны! Бывала, калі царква і зачынена, то ён або падкапаецца, або акно выдзярэ, а ўсё-такі ўлезе.

### У ЯКІ БОК?

Адзін дзядзька не ўмеў запрагаць каня, узяў ды паставіў яго задам наперад у аглоблі, мордай да воза.

А другі кажа:

— Ты ж няправільна запрагаеш.

Дык той:

— Адкуль ты ведаеш, у які бок я паеду?

### РАЗЛІЧЫЎСЯ

Ішлі лесам два вандроўныя гандляры. Раптам насустрач — разбойнікі.

— Рукі ўгору! Аддавайце грошы!

Паднялі гандляры рукі, а адзін з іх і кажа:

— Паны разбойнікі, дазвольце слова сказаць.

— Гавары, ды хутчэй!

Тады гандляр звяртаецца да таварыша:

— Кум! Я табе яшчэ з Вялікадня тысячу рублёў вінен. Дык вось зараз аддаю — мы ў разліку. Паны разбойнікі, будзьце сведкамі.

### НЕПАДСУДНАЯ

Суседкі пасварыліся, і Акуліна паказала Агаце дулю. Агата падала ў суд. Але не «падмазала». Суддзя сказаў:

— За дулю не судзім.

— Не судзіце?.. То на ж і табе, пане суддзя, на і табе, падсудак! — так абдзяліла Агата ўвесь суд дулямі і пайшла дамоў.




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

# У ІНТЭРНЭЦЕ ЁСЦЬ УСЁ...

*Прыстаў унук да дзеда*
*з бабай —*
*Нямілы стаў ім божы свет.*
*— Мне сумна ў вас,*
*А ёсць прываба —*
*Хачу я ўбіцца ў інтэрнэт!*

*Хачу камп'ютар мецць,*
*як людзі, —*
*Я гэта ўбачыў,*
*Гэта ўсёк:*
*З ім клёва, крута*
*чуцца будзем, —*
*У інтэрнэце ёсць усё!*

*— А дзе ж, унучак,*
*браць купіла,*
*Каб на камп'ютар*
*той хапіла? —*
*Спытала баба асцярожна.*
*— Прадаць бычка,*
*кароўку можна, —*
*Унук ураз*
*Знайшоў адказ. —*
*Жыццё ў нас будзе —*
*Проста клас!*

*Дзед слухаў,*
*моўчкі пасміхаўся:*
*Ён сумняваўся,*
*Ён вагаўся,*
*А баба ўвішнаю была:*
*Ад дзеда ўпотай прадала*
*Бычка, кароўку, парасё —*
*У інтэрнэце ёсць усё!*

*Купілі «скрынку».*
*Рады ўнук.*
*Над ёй ад ранку гнецца*
*ў крук,*
*Калечыць вочы і хрыбет:*
*— Ах, што за штука —*
*інтэрнэт!*

*А баба?*
*Шмат дзівос на свеце —*
*З ім днюе баба ў інтэрнэце,*
*Чакае: можа, інтэрнэт*
*Ёй шчаўя зварыць на абед,*
*Бо да нішчымніцы прывыкла.*
*Без малака,*
*Без скваркі —*
*Прыкра.*

*Глядзіць: там п'юць,*
*там гульбаў многа,*
*А ёй — не капае нічога*
*З экрана-дзіва, з інтэрнэту —*
*Сніць малако яна паўлета.*

*І дзед Мірон схуднеў,*
*як струк, —*
*Дзе той бычок,*
*Дзе той вяпрук?*
*Ні кумпяка, ні скваркі нават.*
*Куды ўсё дзелася, цікава?*

*І толькі ўнук*
*з былым імпэтам*
*Муштруе сайты інтэрнэту.*
*Да піва і забаў ахвочы,*
*Перад экранам*
*жмурыць вочы,*
*Як кот, аблашчаны лянотай.*
*Там знойдзе голай*
*дзеўкі фота —*
*Як дурань, лезе цалавацца:*
*Чаго не стукне,*
*блін, у дваццаць?*
*Чаўпе, кудлачыць валассё:*
*— У інтэрнэце ёсць усё!*
*Няўтульна бабе,*
*цень той быццам,*
*Няма куды прыкласці рук,*
*Няма за што ім зачапіцца —*
*Усё загнаў у «скрынку» ўнук.*
*І з ёю, з пенсіяй, бяда:*
*Сцякае ў краму, як вада...*

*Дзед слінкі з голаду глытае,*
*На бабу злосны, як ассё:*
*— Дзе ўсё дабро,*
*Дзе ж праўда тая,*
*Што ў інтэрнэце ёсць усё?*

Уладзімір ЕРМАЛАЕЎ

# КАМУ І КУРЫЦА — ЖАР-ПТУШКА

***На гародзе стары хрэн усё яшчэ заляцаўся да маладой бульбы.***

***Курыца ніколі не адкладвае на заўтра тое, што можна знесці сёння.***

***Вецер у галаве ніколі не бывае спадарожным.***

***Калі чалавеку адкрыць вочы, тады яму цяжка закрыць рот.***

***Дырэктар рынку заўсёды прыйдзе на выручку прадпрымальніку — асабліва тады, калі выручка за дзень добрая.***

***Пакуль адны ловяць жар-птушку, другія ядуць курыцу.***

***І пры віلянні хвастом можна паказаць размах.***

***Іншы раз толькі падумаеш, а ўжо загадваюць памаўчаць.***

***Думай, што гаварыць там, дзе нельга гаварыць тое, што думаеш.***

***Раней цанілі геніяльных, цяпер — генеральных.***

***Каб стаць аптымістам, трэба прыняць рост цяжкасцяў за цяжкасці росту.***

***Для запявалы галоўнае — голас, для падпявалы — слых.***

***Як толькі завострыш пытанне, адразу раяць закругляцца.***

***Палітыку трэба рабіць чыстымі рукамі, а потым іх доўга-доўга мыць.***

***Маленькія падарункі ўмацоўваюць сяброўства, вялікія — карупцыю.***

***Яшчэ невядома, як лёгкія на пад'ём пакажуць сябе на спуску.***





Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Манголія. Кітай. Агат. Накід. Лінь. Кана. Англія. Тын. Кіпарыс. Ізюбр. Індыя. Клас. Валюта. Блузка. Задача. Нож. Тар. Бяліш. Небарака. Тып. НАТА. Рызыка. Уфа. Шторм. Рабат. Клара. Гімалаі. Атрыбут.

**Па вертыкалі:** Малакавоз. Алей. Непал. Юкатан. Дрот. «Чарамшына». Лоеў. Апарат. Нансі. Каморка. Ятаган. Рэлі. Катод. Румба. Крагі. Ара. Данія. Барастат. Алея. Глюк. Блізняты. Ікра. Кошык. Японія. Стаж. Парытэт.

**Даты | Падзеі | Людзі**

**1885** год — нарадзіўся Аляксандр Лаўрэнцьевіч Бурбіс, удзельнік беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, тэатральны дзеяч. З 1921 года — намеснік наркама замежных спраў БССР, адзін з арганізатараў Таварыства Чырвонага Крыжа БССР. Ідэі, погляды і дзейнасць Бурбіса зрабілі ўплыў на фарміраванне дзяржаўнай палітыкі БССР у 1920-я гады, садзейнічалі ўзбуйненню тэрыторыі БССР. Аўтар «Кароткага нарыса па эканамічнай геаграфіі Беларусі», артыкула «Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху». Адзін з заснавальнікаў беларускага прафесійнага тэатра, акцёр і рэжысёр. Удзельнічаў у рабоце Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага, Беларускага музычна-драматычнага гуртка ў Вільні. Паставіў спектаклі «Па рэвізіі» і «Прыкінуліся дурнямі» М. Крапіўніцкага, «Сватаўство» В. Дуніна-Марцінкевіча. Памёр у 1922 годзе.

**1854** год — нарадзіўся французскі паэт Арцюр Рэмбо. Ён памёр рана — у 37 гадоў, а з літаратуры сышоў яшчэ раней. Рэмбо хацеў змяніць свет сваімі вершамі, але хутка зразумеў, што гэта немагчыма, і да 20 гадоў, калі некаторыя паэты толькі пачынаюць свой творчы шлях, Рэмбо вырашыў больш не пісаць вершы. Ён пакінуў Еўропу і заняўся камерцыяй у Афрыцы, але на гэтым шляху поспеху не меў. Вершы ж Рэмбо працягвае чытаць увесь свет. Ён застаецца адным з найвялікшых стылістаў у французскай паэзіі. У 1995 годзе рэжысёр Агнешка Холанд зняла карціну «Поўнае зацьменне», дзе ролю Арцюра Рэмбо бліскуча сыграў Леанарда Ды Капрыа.



**1947** год — нарадзіўся (вёска Горна Зэльвенскага раёна) Юрка Голуб, беларускі паэт, празаік, перакладчык. Працаваў рэдактарам на Гродзенскай студыі тэлебачання. З 1978 года — загадчык аддзела культуры абласной газеты «Гродзенская праўда», з 1979-га — загадчык аддзела мастацкага вяшчання Гродзенскага абласнога тэлебачання і радыё. Член СП СССР з 1971 года. Выдаў зборнікі паэзіі «Гром на зялёнае голле», «Дрэва навальніцы», «Векапомнае поле», «Помню пра цябе», «Сын небасхілу», «Поруч з дажджом», «Зажураны камень. Трыялеты», «Брама зімы» і «Багра».

**Было сказана**

**Францыск Скарына (1490 — 1551), беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар:**

***«Без мудрасці і без добрых звычаяў немагчыма жыць годна людзям на зямлі».***

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

**П А К А Ш Т У Й Ц Е !**

## Салата з вэнджанай курыцай

Спатрэбіцца: *шампіньёны (свежыя) — 3-4 шт., перац балгарскі — 1 шт., цыбуля — 1 шт., курыца вэнджаная (можна ўзяць грудку) — 300 г, морква па-карэйску — 100 г, маянэз.*

Дробна наразаем шампіньёны і цыбулю, абсмажваем на алеі. Наразаем кубікамі балгарскі перац. Дадаём парэзаную курыцу, моркву па-карэйску і грыбы з цыбуляй. Запраўляем маянэзам, солім, калі трэба.

## Аўсянае печыва «Любімае»



У місцы змешваем 3 яйкі, 0,5 шклянкі алею, 0,5 шклянкі цукру, 1/3 ч.л. ваніліну, соль. Дадаем аўсяныя шматкі. Добра змешваем.

У сумесь дадаём прамытыя разынкі і фундук (арэхі можна трохі здрабніць).

Усё добра змешваем і даём настаяцца 15 хвілін. А тым часам распальваем духоўку.

Выкладваем цеста лыжкай на добра змазаную бляху. Выпякаем пры тэмпературы 200°C 10—15 хвілін. Трэба сачыць, каб не падгарэлі. Як толькі печыва будзе гатова, трэба хутка зняць яго з бляхі. Смаката: румянае, смачнае, духмянае!

**К У Л І Н А Р Н Ы Я  Х І Т Р А С Ц І**

## Часночная сухая заправа

Дробныя зубкі пачысціць і парэзаць на дробныя кавалачкі. Пасушыць. Сухі часнок здрабніць у кавамолцы. Гэтак жа размалоць сухі корань пятрушкі ці сельдэрэю, дадаць трохі пякучага перцу-парашку, трохі солі. Усё перамяшаць і ссыпаць у шкляны слоік з накрыўкай. І ў вас заўсёды будзе выдатная ўласная заправа для супоў і іншых страў.

## Алей на сухіх баравіках

Бяром чысты слоічак і ў алей без смаку і паху дадаём жменю грыбоў. Змешваем. Ставім у цёмнае сухое месца на два—тры тыдні. Потым, пры неабходнасці, працэджваем, пераліваем у прастэрылізаваную бутэльку і захоўваем у цёмным прахалодным месцы.



Грыбы з алею — выкарыстоўваць па прызначэнні, а вось сам алей можна дадаваць у макарону, запраўляць ім салаты, смажыць на ім бульбу, мяса і г.д.. А яшчэ паспрабуйце проста, з кавалкам свежага белага хлеба!

-2886-

**Х А Т Н І  М А Й С Т А Р**

## Як выбраць клей?

**ПРАБЛЕМА: У драўлянага крэсла адклеілася ножка. ЧЫМ КЛЕІЦЬ? Клеем для дрэва.**

Усім знаёмы жоўты цягучы гумовы клей, але таксама сустракаецца клей белага і карычневага колеру. Асаблівасць у тым, што ўсе дэталі трэба цвёрда фіксаваць, пакуль яны як след не высахнуць, а лішкі клею трэба адразу ж адмываць вадой. Некаторыя віды клею маюць у структуры драўляныя валокны, якія спрыяюць лепшаму афарбоўванню дрэва. Калі вы працуеце з вулічнай мэбляй, майце на ўвазе, што клей трэба выбіраць з водаахоўнай функцыяй. Ён, дарэчы, таксама падыдзе для драўлянай рамкі, якая расклеілася.

**ПРАБЛЕМА: У кубка адкалолася ручка. ЧЫМ КЛЕІЦЬ? Маментальным клеем.**

Пацвярджаючы сваю назву, гэты празрысты клей дзейнічае за секунду. Ён павінен быць мяккім, эластычным, калі часткі, якія неабходна склеіць, маюць выгіны ці рухомыя дэталі (як, напрыклад, спражка ў рэменя ці ручка ў торбы). Не забывайце, што клей схопліваецца маментальна, таму трэба адразу злучаць дэталі ідэальна роўна. Вашы пальцы могуць таксама зліпнуцца, так што трымайце напагатове ацэтон ці аліўкавы алей. Такі клей таксама падыдзе для керамікі, парцэляны, каменьчыка, які выпаў з біжутэрыі, ці адарванага шлёпанца.

**ПРАБЛЕМА: Драўляная ручка трэснула ці адламалася ад металічнай рыдлёўкі або грабляў. ЧЫМ КЛЕІЦЬ? Поліўрэтанавым клеем.**

Клей на поліўрэтанавай аснове прызначаны для склейвання рознага віду матэрыялаў: цэглы, металу, дрэва і г. д. Клей можа быць эластычным ці цвёрдым. Добрая якасць клею ў тым, што ён практычна не змяняе сваіх уласцівасцяў пры тэмпературы ад -50 да +120 °С. Акрамя таго, поліўрэтан водаўстойлівы. Высыхае ён за 24 гадзіны, і вы павінны фіксаваць дэталі на працягу гэтага часу (сцягнуць, звязаць ізастужкай ці прыціснуць грузам). Некаторыя віды клею — карычневага колеру, таму працуйце ў пальчатках і будзьце акуратнымі падчас працы. Ён таксама падыдзе для нумароў дамоў на цаглянай сцяне.

**ПРАБЛЕМА: Адклеіліся махры абажура. ЧЫМ КЛЕІЦЬ? Афарміцельскім клеем.**

Трохі лягчэйшы і больш універсальны, чым канцылярскі клей. Яго формула ідэальная для падклейвання тканіны, паперы, невялікіх драўляных дэталяў, керамікі ці пластыку (клей лічыцца водаўстойлівым, але ў некаторых выпадках дэталі пры намаканні могуць адклейвацца). Ён таксама падыдзе для драўляных цацак ці кардонных скрынак.

-2887-

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.47 | 18.00 | 10.13 |
| Віцебск — | 7.40 | 17.48 | 10.08 |
| Магілёў — | 7.38 | 17.51 | 10.13 |
| Гомель — | 7.31 | 17.50 | 10.19 |
| Гродна — | 8.02 | 18.16 | 10.14 |
| Брэст — | 7.59 | 18.20 | 10.21 |

## Месяц

***Першая квадра 22 кастрычніка. Месяц у сузор'і Казярога.***

## Імяніны

***Пр.*** *Пелагеі, Мікалая, Сяргея, Юльяна.*
***К.*** *Ірэны, Віталя, Яна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Ад жанчын велізарная карысць, нават калі абяцаюць і не прыходзяць: зубы пачышчаны, твар паголены і спіш на свежых прасцінах.**

— Ці праўда, што жанатыя мужчыны жывуць даўжэй халастых?

— Не, гэта ілюзія, проста ім жыццё здаецца даўжэйшым.

**Калі канца свету 21 снежня 2012 года не будзе, то ў мяне ёсць прадчуванне, што 20 верасня 2013 здарыцца небывалы дагэтуль усплёск нараджальнасці.**

— Дарагі, мне трэба паехаць да мамы на два тыдні.

— Сапраўды? Не падманеш, як у мінулы раз?..

**Усё, дарагі, прыехалі... І не трэба ад шчасця зямлю цалаваць. Ты ж сам прапанаваў: «На, парулі!».**

Легла спаць, забылася змыць туш, прачнулася — сапраўдная панда.

**Пятніца — гэта суровае выпрабаванне для нерваў і здароўя. Нервы ў гэты дзень трацяцца на тое, каб дачакацца заканчэння працы. А здароўе — пасля таго, як дачакаешся.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.911. Індэкс 63850. Зак. № 4689.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 19 кастрычніка 2012 года.